

Легендарная Брэсцкая крэпасць днямі адзначыла сваё 170-годдзе. Удзельнікі ваенна-гістарычнага клуба наладзілі з гэтай нагоды своеасаблівае тэатральнае прадстаўленне. СТАР. 2




Беларуская хакейная дружына на беразе Фінскага заліва будзе спрабаваць злавіць птушку ўдачы ў складзе «вялікай васьмёркі» — зборных Фінляндыі, Канады, ЗША, Швейцарыі, Славакіі, Францыі і Казахстана. СТАР. 2



Юраўскі карагод у гэтым куточку Убарцкага Палесся — не проста малітва, звернутая да паганскага бога, які спрыяе земляробству, а сапраўднае рытуальнае дзейства. СТАР. 8

Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

Родная газета на роднай мове

# ЗВЯЗДА

5 МАЯ 2012 г. СУБОТА № 85 (27200) Кошт 1100 рублёў

БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

## ПРЭЗІДЭНТ ПАТРАБУЕ МАКСІМАЛЬНА ЗМЕНШЫЦЬ КОШТ БУДАЎНІЦТВА І РЭКАНСТРУКЦЫІ ЖЫВЁЛАГАДОЎЧЫХ ФЕРМ БЕЗ УРОНУ ДЛЯ ЯКАСЦІ

**Будаўніцтва і рэканструкцыю жывёлагадоўчых ферм у Беларусі неабходна зрабіць максімальна таннейшымі без урону для іх якасці. Аб гэтым кіраўнік дзяржавы Аляксандр Лукашэнка заявіў 4 мая ў час паездкі ў Чэрвеньскі раён Мінскай вобласці.**

Прэзідэнт наведаў малочнатаварную ферму «Чарнава» філіяла «Агра-Бокс-Заатэх» беларуска-італьянскага сумеснага прадпрыемства «Унібокс».

Гаворачы аб будаўніцтве і тэхнічным пераасначшэнні малочнатаварных ферм, кіраўнік дзяржавы падкрэсліў: «Нам не патрэбна сярэдняя па цане ферма. Нам патрэбна самая танная». Аднак пры гэтым «недапушчальна спрашчацца» і змяншаць кошт будаўніцтва ў выніку адмовы ад новых высокаэфектыўных тэхналогій на карысць састарэлых.

Паводле слоў Аляксандра Лукашэнкі, галоўнае цяпер — хутчэй перавесці жывёлу, асабліва дойны статак, з памяшканняў ферм, якія не адпавядаюць сучасным патрабаванням. «Гэта здароўе жывёл, зусім іншая якасць малака. Трэба хутчэй жывёлу забраць з дрэнных ферм», — сказаў Прэзідэнт. Ён адзначыў, што «стандарты, якія прымяняюцца да якасці выраблямай у Беларусі малочнай прадукцыі, ужо вышэйшыя за еўрапейскія, і гэта агульнапрызнана».

Кіраўнік дзяржавы лічыць, што пры будаўніцтве і рэканструкцыі малочнатаварных ферм магчымы і нейкі прамежкавы варыянт. «Але гэта не значыць, што мы будзем узводзіць часовыя збудаванні. І менш паказухі», — запатрабаваў Аляксандр Лукашэнка, адзначыўшы, што таксама неабходна арганізаваць належную тэхналогію ўтрымання жывёлы.

На малочнатаварнай ферме «Чарнава» Аляксандр Лукашэнка азнаёміўся з тэхналагічным працэсам вытворчасці малака ў новых жывёлагадоўчых памяшканнях, пабудаваных па сучасных айчынных тэхналогіях.

«Сёння ў нас вал жадаючых атрымаць гаспадарку, атрымаць і прадаць малако, мяса. Таму што рынкі Казахстана і Расіі адкрыліся, прадавай куды хочаш, — сказаў кіраўнік дзяржавы. — Я стрымана пакуль да гэтага стаўлюся, але людзям, якія ў нас пачалі працаваць, сябе паказалі, і гэта нашы людзі, трэба прапаноўваць пашырацца».

«Уся рэнтабельнасць тут, у гэтай зямлі. Таму яму (інвестару) трэба даваць нармальную гаспадарку, каб ён займаўся сельскагаспадарчым бізнэсам, зарабляў», — адзначыў Аляксандр Лукашэнка.

«Вось вам, калі ласка, прыватызацыя ў сельскай гаспадарцы: спакойна, нікога не напружваючы, у сялян участкі не адбіраем, зарплата ў іх у тры разы павышаецца», — заўважыў кіраўнік дзяржавы.

Як праінфармавалі Прэзідэнта, у вёску побач з гаспадаркай пачалі вяртацца жыхары. «Вось гэта наш шлях, калі людзі сюды цягнуцца, нармальна жывуць, зямля апрацоўваецца. Таму трэба такім (як кіраўнік «Унібокса»), не баючыся, аддаваць гаспадарку», — падкрэсліў Аляксандр Лукашэнка.

Кіраўніку дзяржавы таксама далажылі аб ходзе веснавых палявых работ у Беларусі. Аляксандр Лукашэнка запатрабаваў значна паскорыцца ў сувязі з тым, што з-за ўмоў надвор'я ў шэрагу рэгіёнаў яшчэ не выйшлі на запланаваныя паказчыкі. Акрамя таго, Прэзідэнт чарговы раз звярнуў увагу як губернатара Міншчыны, так і кіраўнікоў іншых рэгіёнаў краіны на неабходнасць стварэння належных умоў для захоўвання ўгнаенняў. Кіраўнік дзяржавы адзначыў, што пралятаючы на верталёце над некаторымі раёнамі, ён бачыў факты бесгаспадарчасці ў гэтым пытанні.

**Прэс-служба Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь.**

## АЛЯКСАНДР ЛУКАШЭНКА ПАВІНШАВАЎ КАЛЕКТЫЎ РЭДАКЦЫІ ГАЗЕТЫ «ПРАВДА»

**Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка павіншаваў калектыў рэдакцыі і чытачоў газеты «Праўда» са 100-годдзем з дня выхаду першага нумара гэтага выдання.**

«На старонках вашага легендарнага выдання адлюстравана гераічная гісторыя і жыццё вялікай краіны з яе перамогамі, дасягненнямі і цяжкасцямі. Прыемна, што і сёння «Правда» захоўвае свой высокі ўзровень прафесіяналізму, рэпутацыю аднаго з вядучых расійскіх сродкаў масавай інфармацыі», — гаворыцца ў віншаванні.

«Мы высока цэнім аб'ектыўнасць і добразычлівасць асвятлення сучаснай сітуацыі ў Беларусі. Упэўнены, што і надалей творчы калектыў газеты будзе сілай аўтарытэтнага друкаванага слова садзейнічаць развіццю інтэграцыйных працэсаў і ўмацаванню саюзніцкіх адносін паміж нашымі краінамі», — адзначыў кіраўнік дзяржавы.

**Прэс-служба Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь.**

## ПЕРАМАГЛА НАДЗЕЯ!

**«Звязда», як вядома, жаночага роду. І ён, чароўны пол, прадстаўлены ў старэйшай беларускай газеце прыгожымі, надзейнымі, працавітымі каляжанкамі даволі грунтоўна. Як на сапраўднай гаспадыні-беларусцы трымаецца дом, так і ад іх прафесійнай увішнасці, руплівасці ў немалой ступені залежыць імідж нашага выдання. Калі чытачы чакаюць «Звязду» як даўнюю сяброўку, дарадцу — у гэтым і іх немалая заслуга, нашых прыгожых супрацоўніц.**



Фота БЕЛТА.

На здымку: Надзея ДРЫЛА, Надзея РАСОЛЬКА (НІКАЛАЕВА), Марына БЕГУНКОВА.

Можа, таму і не выпадкова, што сёлета менавіта яны — Надзея, Марына і Надзея — наміціраваліся ад «Звязды» на VIII Нацыянальны конкурс друкаваных СМІ «Залатая Літара». Сярод амаль 250 заявак, што былі пададзены на ўдзел у ім з усёй краіны, «пальму першынства» ў намінацыі «Лепшыя матэрыялы сацыяльнай тэматыкі» вырашыла аспрэчыць рэдактар аддзела сацыяльных праблем Надзея ДРЫЛА, у намінацыі «Лепшы фотакарэспандэнт» — вядучы фотакарэспандэнт Марына БЕГУНКОВА, у намінацыі «Лепшы аглядальнік» — рэдактар аддзела адукацыі Надзея РАСОЛЬКА (творчы псеўданім Надзея НІКАЛАЕВА).

...Ужо адбылося пасяджэнне журы, падчас якога былі вызначаны лаўрэаты конкурсу, але інтрыга захоўвалася практычна да самага апошняга — да моманту цырымоніі ўзнагароджання журналістаў рэспубліканскіх і рэгіянальных СМІ ў Нацыянальнай бібліятэцы. Адзін за адным пераможцы ў намінацыях атрымліваюць дыпломы і памятныя знакі — сімвалы конкурсу — «Залатую Літару». **Кветкі, апладысменты, віншаванні ўсім калегам!** Дыпломы ў намінацыях «Лепшыя матэрыялы сацыяльнай тэматыкі» і «Лепшы фотакарэспандэнт» уручаюцца Надзеі ДРЫЛЕ і Марыне БЕГУНКОВАЙ. «Залатую Літару» ў намінацыі «Лепшы аглядальнік» за асвятленне праблем адукацыі атрымлівае Надзея РАСОЛЬКА (Надзея НІКАЛАЕВА)! Віншуем калег, зычым ім далейшых прафесійных поспехаў: цікавых тэм, вострага пяра і ўдалага кадра!

**Сяргей СТАРЫНАЎ.**

**УРАДАВАЯ ТЭЛЕГРАМА**

## З ДНЁМ ДРУКУ!

Напярэдадні прафесійнага свята ў рэдакцыю «Звязды» прыйшла ўрадавая тэлеграма з віншаваннямі калектыву з нагоды Дня друку.

***«Шчыра жадаю вам высока трымаць планку аўтарытэту газеты, здабытага плённай працай некалькіх пакаленняў звяздоўцаў, памнажаць творчыя поспехі ў рэалізацыі новых ідэй і праектаў. Моцнага здароўя і здзяйснення добрых надзей усім, хто робіць газету».***

**Старшыня Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь У.П. АНДРЭЙЧАНКА.**

НАДВОР'Е СЁННЯ

| | |
|---|---|
| Брэст | + 26° |
| Віцебск | + 22° |
| Гомель | + 24° |
| Гродна | + 24° |
| Магілёў | + 20° |
| Мінск | + 24° |

Курсы замежных валют, устаноўленыя НБ РБ з 04.05.2012 г.

| | | |
|---|---|---|
| Долар ЗША | 8120,00 | ▼ |
| Еўра | 10670,00 | ▼ |
| Рас. руб. | 274,50 | ▼ |
| Укр. грыўня | 1010,39 | ▼ |

## МІХАІЛ МЯСНІКОВІЧ ДАРУЧЫЎ ВЫРАШЫЦЬ ПЫТАННІ КАДРАВАГА ЗАБЕСПЯЧЭННЯ СІСТЭМЫ АГУЛЬНАЙ СЯРЭДНЯЙ АДУКАЦЫІ

**Прэм'ер-міністр Беларусі Міхаіл Мясніковіч даручыў Мінадукацыі і зацікаўленым міністэрствам і ведамствам вырашыць пытанні кадравага забеспячэння сістэмы агульнай і сярэдняй адукацыі. Аб гэтым ён заявіў 4 мая на пасяджэнні Прэзідыума Саўміна, дзе разглядаўся ход выканання праграмы развіцця агульнай сярэдняй адукацыі Беларусі на 2007—2016 гады, перадае БЕЛТА.**

Паводле слоў кіраўніка ўрада, у асобных рэгіёнах адчуваецца недахоп кадраў у школах. «Калі глядзіш матэрыялы, бачыш: не хапае настаўнікаў інфарматыкі, фізікі, матэматыкі, замежнай мовы, — канстатаваў ён. — Сістэма для сябе рыхтуе кадры і рыхтуе недастаткова, не працуе над замацаваннем гэтых кадраў».

Міхаіл Мясніковіч адзначыў, што пытанні кадравага забеспячэння, павышэння якасці адукацыі, абсталявання ўстаноў адукацыі, асабліва пытанні развіцця сучаснага інфармацыйнага асяроддзя, патрабуюць больш увагі. «Мы павінны ісці ў нагу з часам і нават з пэўным апярэджаннем у гэтым плане», — падкрэсліў ён.

Аналізуючы вынікі выканання праграмы развіцця агульнай сярэдняй адукацыі ў Беларусі з пункту гледжання фінансавання яе мерапрыемстваў, прэм'ер-міністр звярнуў увагу, што толькі рэспубліканскі бюджэт выканаў свае абавязацельствы па праграме. «Калі гаварыць пра абласныя і мясцовыя бюджэты, то, на жаль, гэта толькі 20 працэнтаў. Горш за ўсіх выглядаюць Віцебская і Брэсцкая вобласці (у два разы ніжэй за гэты ўзровень)», — канстатаваў ён. У абласных бюджэтах знаходзяцца сродкі для падтрымання тых ці іншых праектаў, стварэння і мадэрнізацыі вытворчасці, будаўніцтва, аднак адукацыі ўдзяляецца недастаткова ўвагі. Разам з тым, на думку Міхаіла Мясніковіча, гэта пытанне патрабуе вырашэння нараўне з іншымі.

## ЖУРНАЛІСТЫ ПАВІННЫ ЎМЕЦЬ ПРАВІЛЬНА РАСПАРАДЖАЦЦА СІЛАЙ ДРУКАВАНАГА СЛОВА

**Журналісты павінны ў поўнай меры ўсведамляць сілу друкаванага слова і ўмела распараджацца ёю. Такое меркаванне выказаў 4 мая першы намеснік кіраўніка Адміністрацыі Прэзідэнта Аляксандр Радзькоў, уручаючы ўзнагароды пераможцам VIII Нацыянальнага конкурсу друкаваных СМІ «Залатая Літара», перадае БЕЛТА.**

«Вельмі важна, каб журналісты разумелі сілу друкаванага слова і адказнасць за яго», — падкрэсліў Аляксандр Радзькоў. Не менш важна, на яго думку, уменне журналістаў правільна распараджацца сілай слова і працаваць на павышэнне аўтарытэту свайго выдання, мудра карыстацца сваімі прафесійнымі навыкамі для паляпшэння жыцця ў краіне.

У сваю чаргу старшыня журы конкурсу, старшыня Саюза пісьменнікаў Беларусі Мікалай Чаргінец адзначыў, што з году ў год расце колькасць работ, прадстаўленых на конкурс, паляпшаецца іх якасць. Пры вызначэнні пераможцаў конкурсу ў журы разгараюцца гарачыя спрэчкі, таму што выбіраць даводзіцца сярод вельмі разнапланавых журналісцкіх прац. Мікалай Чаргінец лічыць, што ў наступным годзе журы трэба больш смела заахвочваць асобных журналістаў за аўтарскія матэрыялы, і абяцае, што ў будучым павялічыцца колькасць намінацый конкурсу.

Урачыстая цырымонія ўзнагароджвання пераможцаў VIII Нацыянальнага конкурсу друкаваных СМІ «Залатая Літара» прайшла 4 мая ў Нацыянальнай бібліятэцы Беларусі. Асноўнай мэтай Нацыянальнага творчага конкурсу СМІ з'яўляецца ўсямернае садзейнічанне развіццю друкаваных сродкаў масавай інфармацыі, актуалізацыя значных тэматычных напрамкаў дзейнасці друкаваных СМІ па рэалізацыі дзяржаўнай інфармацыйнай палітыкі, павышэнне прафесійнага і ідэйна-змястоўнага ўзроўню СМІ, стымуляванне творчай дзейнасці журналістаў і іншых творчых работнікаў, занятых у працэсе вытворчасці друкаваных выданняў.

**ДА ВЕДАМА ЧЛЕНАЎ САВЕТА РЭСПУБЛІКІ НАЦЫЯНАЛЬНАГА СХОДУ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ**

**8 мая 2012 года ў 09.00 у зале пасяджэнняў Савета Рэспублікі (вул. Чырвонаармейская, 4) адбудзецца пасяджэнне восьмай сесіі Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь чацвёртага склікання.**

### Фінансавы тыдзень

## ДОЛАР ПРАЦЯГВАЕ РАСЦІ

**У «амерыканца» нечакана «паднялася тэмпература», але па выніках тыдня хвароба была не такой моцнай.**

Долар пасля пад'ёму адразу на 1,5% у чацвер увогуле на фініш прыйшоў толькі з падаражэннем на 70 рублёў (плюс 0,9%) да 8120. Еўра дадаў 50 рублёў (плюс 0,5%) і каштуе 10670. Да 274,5 рубля апусціўся расійскі рубель, які патаннеў усяго на 0,5 (мінус 0,2%).

У свеце ж вызначылі самыя моцныя банкі. У топ-10 рэйтынгу часопіса «Bloomberg Markets» увайшлі тры сінгапурскія і чатыры канадскія банкі. Такія магутныя пазіцыі канадскіх банкаў выкліканы, на думку экспертаў, высокім узроўнем капіталу, кансерватыўнай культурай крэдытавання і жорсткім наглядам з боку адзінага рэгулюючага органа. Там заўсёды адкладвалі грошы ў рэзервы на пакрыццё магчымых страт. Можа, калі б усе так рабілі, фінансавы крызіс быў бы не такім моцным. Дарэчы, аб крызісе: міжнароднае рэйтынгавае агенцтва «Standard & Poors» павысіла крэдытны рэйтынг Грэцыі і дала стабільны прагноз. Дэфолту пазбегнуць змаглі.

**Уладзіслаў КУЛЕЦКІ**

## ГРАФІК ВЫПЛАТЫ ПЕНСІЙ У БЕЛАРУСІ СКАРЭКТАВАНЫ Ў СУВЯЗІ СА СВЯТКАВАННЕМ 9 МАЯ

Графік выплаты пенсій у Беларусі скарэктаваны ў сувязі са святкаваннем Дня Перамогі, паведамілі БЕЛТА ў РУП «Белпошта». Датэрміновая выплата пенсій (дапамог) за 9 мая пачнецца ў аддзяленнях паштовай сувязі Мінска з 5 мая, у гарадскіх аддзяленнях паштовай сувязі Брэсцкай вобласці і Магілёва — з 7 мая, а ў аддзяленнях паштовай сувязі Віцебскай, Гомельскай, Гродзенскай, Мінскай, Магілёўскай і сельскіх аддзяленнях паштовай сувязі Брэсцкай вобласці — з 8 мая. 9 мая будуць функцыянаваць толькі дзяжурныя аддзяленні паштовай сувязі.

## ЯКІМ БУДЗЕ ГРАФІК РАБОТЫ ТРАНСПАРТУ 9 МАЯ?

9 мая рэгулярныя рэйсы па міжгародніх маршрутах будуць выконвацца па графіках будных дзён (серады). Гаворка ідзе пра тыя з іх, якія абслугоўваюцца дзяржаўным прадпрыемствам «Мінсктранс». Калі ж гаварыць пра рэгулярныя рэйсы па прыгарадных маршрутах, дык 8 мая яны будуць выконвацца па раскладзе пятніц, 9 мая — па графіку нядзельных дзён.

**Сяргей РАСОЛЬКА.**

## ХРОНІКА АПОШНІХ ПАДЗЕЙ

### ЕЎРАКАМІСАРЫ АБВЯСЦІЛІ БАЙКОТ ЕЎРА-2012 ВА УКРАІНЕ



Члены Еўракамісіі вырашылі байкатаваць чэмпіянат Еўропы па футболе ва Украіне з-за палітычнай сітуацыі ў гэтай краіне ў цэлым і сітуацыі з экс-прэм'ерам Юліяй Цімашэнка ў прыватнасці, паведаміла ў пятніцу еўракамісар па пытаннях спорту Андрула Васіліу. «Я падзяляю гэтую занепакоенасць і таму прыняла рашэнне ў якасці еўрапейскага камісара, які адказвае за спорт, што ў гэтых умовах для мяне з'яўляецца немэтазгодным прысутнічаць на любых матчах, якія будуць праводзіцца ва Украіне. Гэты пункт гледжання падзяляе і старшыня, і іншыя члены Еўрапейскай камісіі», — гаворыцца ў заяве Васіліу.

### У ПАЛАНЗЕ АБКЛАЛІ ПАДАТКАМ АДПАЧЫВАЛЬНІКАЎ

На літоўскім курорце Паланга вырашылі спаганяць падатак з адпачываючых, паведамляе Delfi.lt. Адпаведнае рашэнне прыняў мясцовы гарсавет. Ужо з 1 чэрвеня турысты, якія спыніліся ў Паланзе ў гасцініцы або на здымнай кватэры, павінны будуць плаціць дадаткова па адным ліце (каля 30 еўрацэнтаў) за ноч. Сабраныя грошы будуць накіраваны ў гарадскі бюджэт. Раней у мэрыі горада адзначалі, што грошы будуць спаганяцца і з тых, хто спыняецца ў дамах адпачынку і іншых падобных установах. Падатак, як адзначаецца, не будуць спаганяць з дзяцей ва ўзросце да 10 гадоў, а таксама з пацыентаў бальніц і рэабілітацыйных цэнтраў.

### САМАЯ СЭКСУАЛЬНАЯ ЖАНЧЫНА Ў СВЕЦЕ — СПЯВАЧКА ТУЛА



Топ-100 самых сэксуальных жанчын планеты Зямля за 2012 год па версіі мужчынскага часопіса FHM, узначаліла 23-гадовая брытанская спявачка Туліза (Тула) Кантастаўлас, дачка ірландкі і грэка-кіпрыёта, піша NEWSru Ізраіль. Тым часам актрыса і мадэль Розі Хантынгтан-Уайтлі, якая ўзначальвала леташні рэйтынг самых сэксуальных жанчын, на гэты раз заняла толькі 18 месца. Другое месца ў спісе дасталася брытанскай спявачцы Шэрыл Коўл. А «бронзу», як і ў мінулым годзе, атрымала спявачка Рыяна.

ISSN 1990 - 763X

### ПАДРАБЯЗНАСЦІ

## МАХАЧКАЛА: АД 30 ДА 100 КІЛАГРАМАЎ У ТРАЦІЛАВЫМ ЭКВІВАЛЕНЦЕ, 13 ЗАГІНУЛЫХ



**Нацыянальны антытэрарыстычны камітэт паведаміў, што магутнасць дзвюх выбуховых прылад, якія спрацавалі на паліцэйскім пасту ў Махачкале і якія забралі жыцці 13 чалавек, склала 30 і 50 кілаграмаў у траціллавым эквіваленце. Паводле інфармацыі паліцыі, на месцы двайнога тэракту знойдзены фрагменты цел, якія могуць належаць тэрарыстам-смяротнікам.**

У той жа час у МУС іншыя ацэнкі: магутнасць другой бомбы, якая была начынена паражальнымі элементамі, склала каля 100 кілаграмаў у траціловым эквіваленце. У выніку двух выбухаў загінулі 12 чалавек, каля 90 дастаўлены ў бальніцы горада. Сярод загінулых і пацярпелых — супрацоўнікі МУС, МНС Расіі і цывільныя асобы.

Раней крыніца ў сілавых структурах рэспублікі паведамляла аб 13 загінулых і амаль 110 параненых пры выбухах.

### КОРАТКА

У Беларусі за 2011 год грашовую дапамогу на аздараўленне атрымалі 22,7 тыс. інвалідаў і ўдзельнікаў Вялікай Айчыннай вайны. Затраты на гэтыя мэты з рэспубліканскага бюджэту перавысілі Br8 млрд, паведамілі БЕЛТА ў Міністэрстве працы і сацыяльнай абароны. У адпаведнасці з заканадаўствам Героі Савецкага Саюза, поўныя кавалеры ордэна Славы, непрацуючыя інваліды і ўдзельнікі Вялікай Айчыннай вайны маюць права на атрыманне грашовай дапамогі на аздараўленне ў памеры 10 базавых велічынь — у выпадку, калі яны не скарысталіся правам на бясплатную санаторна-курортную пуцёўку.

У Беларусі захоўваюцца спрыяльныя ўмовы для правядзення веснавых палявых работ, паведамілі БЕЛТА ў аддзеле аграметэаралагічных прагнозаў Рэспубліканскага гідраметэацэнтра. На большай частцы краіны верхні 10-сантыметровы пласт глебы знаходзіцца ва ўмерана вільготным стане. Сярэдняя тэмпература верхняга пласта глебы складае плюс 13-18 градусаў, у паўднёвай зоне — 19-21 градус цяпла.

## ЦІ АБУРАЕ ВАС ПАРКОЎКА ПРЫВАТНЫХ АЎТО НА ТРАТУАРАХ?



**Руслан Шайкін, кансультант праектаў грамадскай арганізацыі «Ахова птушак Бацькаўшчыны»:**

— Так, я не разумею тых аўтаўладальнікаў, якія ставяць свае «колы» на газонах, тратуарах ці на дзіцячых пляцоўках. І ў мяне ёсць машына, але я лепш прайдуся лішніх 10—15 хвілін... Аўтамабіляў у жыхароў гарадоў стала значна больш. У Мінску пытанне паркоўкі ператвараецца ў сур'ёзную праблему. Аўтастаянкі будаваць трэба, але пажадана не рабіць гэта за кошт скарачэння плошчаў зялёнай зоны.



**Алена Снітко, юрысконсульт прыватнай фірмы, г. Мінск:**

— Абурае — гэта не тое слова. Мне здаецца, што ў асобных уладальнікаў «жалеза» ўвогуле няма сумлення. Машыны часам ставяць такім чынам, што дзеці з пад'езда жылых дамоў вымушаны выскокваць адразу на дарогу. З такімі парушальнікамі трэба змагацца ўсім і заўсёды. І рабіць гэта няцяжка. Любы жыхар дома мае права выклікаць супрацоўніка ДАІ, які павінен будзе скласці пратакол аб адміністрацыйным парушэнні. У гэтым выпадку парушальніка могуць папярэдзіць ці аштрафаваць на 1 базавую велічыню. Больш за тое, калі парушальнік правіл стаянкі адсутнічае на месцы, а яго машына стварае сітуацыю з пагрозай бяспекі грамадзян, тады машыну могуць прымусова адбуксаваць на штраф-стаянку.



**Юрый Пудышаў, чэмпіён СССР 1982 года па футболе:**

— Машыны на тратуарах — гэта сапраўднае прававое бязмежжа ў нашай сталіцы. Іх у нашых дварах ужо столькі, што паветраныя масты будаваць трэба. Міліцыянераў выклікаць да кожнай машыны? Можа, і так, але тады штат міліцыі трэба будзе павялічыць у некалькі разоў. А ў Маскве, напрыклад, на шкло такіх машын спецыяльныя паперкі наклейваюць. Каб быў маладзейшы, то, мабыць, колы ім бы праколваў... Аднак гэта не наш метад...

**Падрыхтаваў Сяргей КУРКАЧ.**

# ПАДАРУНАК ВЕТЭРАНАМ ДА ДНЯ ПЕРАМОГІ

**Дзяржава зрабіла падарунак ветэранам да 67-й гадавіны Вялікай Перамогі. Так заявіла міністр працы і сацыяльнай абароны Беларусі Марыяна Шчоткіна на ўрачыстай цырымоніі адкрыцця лячэбна-аздараўленчага корпуса ДУ «Рэспубліканскі інтэрнат ветэранаў вайны і працы», што адбылася ў пятніцу, 4 мая.**

Адкрыццё двухпавярховага лячэбна-аздараўленчага корпуса з басейнам, саўнай, наборам сучаснага абсталявання для лячэння і рэабілітацыі дазволіць аказваць ветэранам вайны і працы больш шырокі спектр сацыяльна-рэабілітацыйных паслуг. Тут ёсць душ Шарко і падводны душ-масаж, абсталявана памяшканне для галатэрапіі, якое імітуе прыродную салевую пячору. Да паслуг ветэранаў, якія пражываюць тут, — спартыўная зала, абсталяваная ў адпаведнасці з сучаснымі патрабаваннямі. За 2008—2011 гады на будаўніцтва корпуса было накіравана 10,9 млрд рублёў.

Рэспубліканскі інтэрнат ветэранаў вайны і працы, што знаходзіцца ў пасёлку Ждановічы Мінскага раёна, займае асаблівае месца ў рэспубліцы. Ён быў пабудаваны ў 1974 годзе па ініцыятыве П.М. Машэрава і па праве з'яўляецца лепшай у краіне стацыянарнай установай сацыяльнага абслугоўвання. У інтэрнаце пражываюць заслужаныя людзі, якія ўнеслі важкі ўклад у абарону Радзімы ў гады Вялікай Айчыннай вайны і развіццё народнай гаспадаркі краіны ў мірны час.

Зараз у ім знаходзяцца 163 чалавекі, з іх 12 інвалідаў Вялікай Айчыннай вайны, 45 удзельнікаў Вялікай Айчыннай вайны, 8 працаўнікоў тылу, 10 былых вязняў фашысцкіх канцлагераў, 3 сям'і загінулых у гады Вялікай Айчыннай вайны, 85 ветэранаў працы. Сямейным парам тут вылучаецца асобны блок з двух пакояў з усімі выгодамі, адзінокім — па асобным пакоі кожнаму ў такім блоку. У жылых пакоях ёсць усе выгоды, халадзільнікі і тэлевізары, гарадскія тэлефоны. Сярэдні ўзрост тых, хто пражывае ў гэтай установе, — 83 гады.

«Гэтыя людзі шмат бачылі, перажылі, сама магчымасць стасункаў з імі — унікальная для маладога пакалення», — упэўнена **Марыяна ШЧОТКІНА**. А **намеснік прэм'ер-міністра Анатоль ТОЗІК**, які прысутнічаў на цырымоніі адкрыцця, назваў іх «залатым фондам нацыі».

Паводле слоў віцэ-прэм'ера, у краіне сёння пражываюць 21500 удзельнікаў Вялікай Айчыннай вайны і крыху больш за 30 тысяч ветэранаў. «Мы ўсіх іх ведаем персанальна. Сярод іх няма нікога, хто быў бы забыты. Нам не сорамна перад ветэранамі вайны, у Беларусі магчымасці дзяржаўнай сацыяльнай падтрымкі выкарыстоўваюцца максімальна», — заявіў Анатоль Тозік.

Акрамя таго, дзяржава робіць усё, што ў яе сілах, каб палепшыць якасць жыцця ўсіх пажылых людзей.

**Святлана БУСЬКО.**

# СВЯТА ПРОЙДЗЕ ПАД ВІДЭАНАЗІРАННЕМ

**Летась у святочных мерапрыемствах 9 мая ўзялі ўдзел каля 1,1 млн нашых грамадзян і гасцей краіны. Мяркуецца, што сёлета не меншая колькасць людзей пажадае далучыцца да святкавання Дня Перамогі.**

Паколькі самыя значныя і масавыя падзеі па традыцыі адбудуцца ў сталіцы, то і самыя сур'ёзныя меры бяспекі прадугледжаны менавіта тут. Паводле слоў **першага намесніка начальніка ўпраўлення аховы правапарадку і прафілактыкі Міністэрства ўнутраных спраў Беларусі Івана КУБРАКОВА,** усе месцы правядзення масавых мерапрыемстваў, а таксама прылеглыя да іх тэрыторыі, месцы масавага адпачынку, асабліва тыя, што бліжэй да вадаёмаў, будуць узяты органамі ўнутраных спраў пад асаблівы кантроль. Падчас правядзення ранішняга шэсця каля Палаца спорту і ў парку Перамогі будзе ажыццяўляцца кантрольна-прапускны рэжым. Пропуск гледачоў будзе арганізаваны з абавязковым аглядам ручнымі і стацыянарнымі металадэтэктарамі. Зразумела, забароненыя прадметы першапачаткова не варта браць з сабой. Акрамя таго, каб не абцяжарваць пропуск усіх ахвотных і не перашкаджаць іншым атрымліваць асалоду ад гулянняў, не рэкамендуецца наведваць масавыя мерапрыемствы на веласіпедах або спалучаць такі паход з выгулам хатняй жывёлы. У месцах правядзення масавых мерапрыемстваў органы міліцыі будуць ажыццяўляць відэаздымкі.

У Дзяржаўтаінспекцыі зараз плануюць схему абмежавання руху. Вядома, што ён будзе абмяжоўвацца раніцай, падчас правядзення святочнага шэсця, на ўчастку вуліц Энгельса — Казлова. А ўвечары падчас правядзення салюту ў раёне парку Перамогі рух аўтатранспарту абмяжоўваць не плануецца.

Ва ўзмоцненым рэжыме будуць працаваць у святочны дзень і ўсе арганізацыі аховы здароўя. У сталіцы для медыцынскага забеспячэння плануецца задзейнічаць 37 брыгад хуткай меддапамогі (10 з іх — рэзервовыя) і 16 урачэбна-сястрынскіх брыгад ад паліклінік. Плюс адзін перасоўны аптэчны пункт, перасоўны рэзерв з насілкамі і два санітарныя аўтамабілі для дастаўкі прэпаратаў крыві ў арганізацыі аховы здароўя. У дзевяці гарадскіх клінічных бальніцах, якія аказваюць кругласутачную экстранную меддапамогу, дадаткова арганізавана дзяжурства на працоўных месцах урачоў-анестэзіёлагаў-рэаніматолагаў, медсясцёр-анестэзістак, урачоў-хірургаў і аперацыйных медсясцёр. Прадугледжана ўзмацненне дзяжурна-дыспетчарскай службы станцыі хуткай меддапамогі. Медыцынскае забеспячэнне ў раёнах горада будзе арганізавана медработнікамі ад тэрытарыяльных паліклінік.

Міністэрства аховы здароўя заклікае ўсіх грамадзян апранацца па надвор'і і не злоўжываць алкаголем (як вядома, зараз не прадугледжаны меры па абмежаванні продажу алкагольных напояў у святочныя дні), а шаноўных ветэранаў просяць дабірацца да месцаў правядзення мерапрыемстваў не пешшу, а на транспартных сродках.

**Святлана БАРЫСЕНКА.**

# МОМАНТ ІСЦІНЫ ДЛЯ СТАРОЙ КРЭПАСЦІ

**Легендарная Брэсцкая крэпасць днямі адзначыла сваё 170-годдзе. Удзельнікі ваенна-гістарычнага клуба наладзілі з гэтай нагоды своеасаблівае тэатральнае прадстаўленне. На пляцы маршыравалі воіны ў форме розных эпох і розных армій — тых, што служылі ў крэпасці, абаранялі яе.**


Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

З'явілася нагода згадаць гісторыю магутнейшай «фартэцыі» Расійскай імперыі. Менавіта імператар Мікалай І у 1830 годзе ўзгадніў і ўхваліў праект узвядзення крэпасці ў Брэст-Літоўску, праз тры гады манарх асабіста зацвердзіў план будаўніцтва. Тады і пачаліся падрыхтоўчыя земляныя работы. А ў чэрвені 1836 года быў урачыста закладзены першы камень будучай цытадэлі. У падмурку казармы тады замуравалі памятную дошку і куфэрак з манетамі — іх знайшлі ў 1953 годзе пры разборы завалаў... А 26 красавіка 1842 года над крэпасцю ўзнялі сцяг і правялі парад, што азначала ўступленне яе ў строй дзеючых.

За шэсць гадоў ваенныя будаўнікі ўзвялі небывалы фарпост. Галоўным умацаваннем крэпасці стала двухпавярховая казарма працягласцю 1,8 кіламетра з шэрагам праязных варот. Таўшчыня сцен казармы дасягала двух метраў. У іх былі прарэзаны шматлікія байніцы і амбразуры. З трох бакоў цытадэль прыкрывалі ўмацаванні — Цярэспальскае, Кобрынскае і Валынскае. Іх абаранялі дзясяціметровыя земляныя валы з убудаванымі ўнутры цаглянымі казематамі, перад якімі былі выкапаны каналы, запоўненыя вадой. Крэпасць выглядала магутнай і на той час непрыступнай. Праўда, яе ўзвялі на месцы старажытнага Брэста, які фактычна зруйнавалі, папярэдне прымусова адсяліўшы жыхароў... Але гэта ўжо іншая гісторыя.

Да пачатку Першай сусветнай вайны крэпасць уяўляла сабой фартыфікацыйны комплекс, які дазваляў гарнізону ў выпадку асады пратрымацца 8 месяцаў. Але тады скарыстаць магчымасці аб'екта не давялося. Імклівае наступленне кайзераўскіх войскаў у 1915 годзе прымусіла прыняць рашэнне аб эвакуацыі гарнізона. У ноч з 12 на 13 жніўня рускія войскі пакінулі крэпасць і горад. Пры гэтым палічылі немэтазгодным пакідаць ворагу фарпост. Усё, што можна было — фарты, казармы, — узарвалі.

У сакавіку 1918 года ў Белым палацы крэпасці быў падпісаны вядомы Брэсцкі мір. З 1921 па 1939 год Брэст уваходзіў у склад Польшчы. І ў крэпасці размяшчаўся гарнізон польскага войска, які мужна абараняўся ад немцаў у верасні 1939 года. Але немцы бамбілі горад і крэпасць, і абаронцы вымушаны былі пакінуць цытадэль. Многа чаго пабачыла крэпасць у трагічным 39-м. Сотні забітых і параненых, бамбёжку, а потым і сумесны парад войскаў Гудэрыяна з часцямі Чырвонай Арміі, якія прыйшлі сюды 22 верасня.

Але, як заўважыла на мерапрыемстве ў гонар 170-годдзя крэпасці намеснік дырэктара па навуковай рабоце Мемарыяльнага комплексу «Брэсцкая крэпасць-герой» Ларыса Бібік, момантам ісціны для крэпасці стаў 1941 год. Пра дні і месяцы гераічнай абароны, пра герояў крэпасці ведаюць усе. Напісаны кнігі, створаны фільмы. Таму едуць і едуць сюды людзі з розных гарадоў і краін. Не так даўно прымалі ўдзельнікаў міжнароднага праекта «Дарогамі Перамогі», якія пяццю аўтамабільнымі экіпажамі стартавалі 3 красавіка ў Севастопалі. Маршрут сімвалічна аб'яднаў 13 гарадоў-герояў, 35 гарадоў воінскай славы і 10 гарадоў, якія ўзнагароджаны ордэнам Вялікай Айчыннай вайны І ступені. Удзельнікі аўтапрабегу пераадолелі 7 тысяч кіламетраў. А на плошчы Цырыманіялаў легендарнай цытадэлі да іх далучыліся брэсцкія ветэраны і моладзь. Усе разам разгарнулі велізарнае палатно — сімвалічны сцяг Перамогі. І з ім прайшлі да Вечнага агню.

Праз колькі дзён крэпасць сустракала ўдзельнікаў акцыі «На шляху ў Берлін», арганізаванай грамадскай арганізацыяй з С.-Пецярбурга. Да іх далучыўся і наш ветэран Юрый Тэрталь, які з 1945 года не быў у Берліне. Удзельнікаў патрыятычнай акцыі віталі каля Вечнага агню крэпасці дыпламаты, кіраўнікі горада над Бугам, прадстаўнікі грамадскасці.

Напярэдадні Дня Перамогі і 22 чэрвеня традыцыяй сталі «Цягнікі памяці», якія ранкам прыбываюць з Масквы ў Брэст. Не раз гасцямі крэпасці станавіліся прэзідэнты Расіі, іншых краін, прэм'ер-міністры дзяржаў, кіраўнікі дыпламатычных місій.

А 9 мая, здаецца, увесь Брэст ідзе ў крэпасць. Для многіх і многіх сем'яў гэта стала сямейнай традыцыяй. І не трэба людзям ніякага дадатковага запрашэння. Хаця апошнім часам арганізавана ідуць на мітынг працоўныя калектывы, педагогі вядуць школьнікаў і студэнтаў. Але многа і тых, хто спяшаецца ў свяшчэннае месца па закліку душы. А як жа інакш? Тут быў зроблены самы першы крок да Вялікай Перамогі.

Як заўсёды, 9 мая прыйдзе на мітынг і парад Пётр Паўлавіч Кацельнікаў, адзіны з абаронцаў крэпасці, які жыве ў Беларусі. Выхаванец музычнага ўзвода 44-га стралковага палка нараўне з дарослымі прайшоў усе жахі і выпрабаванні лета 1941 года. Менавіта ён паслужыў прататыпам аднаго з галоўных герояў фільма «Брэсцкая крэпасць» — сумеснага праекта Беларусі і Расіі. Іх, жывых сведак «моманту ісціны», застаецца ўсё менш. Ім — наша асаблівая пашана.

**Святлана ЯСКЕВІЧ.**

# ПЫТАННЕ ПАВЫШЭННЯ ПЕНСІЙНАГА ЎЗРОСТУ ЗНЯТА З ПАРАДКУ ДНЯ

**Аб гэтым заявіў журналістам намеснік прэм'ер-міністра Анатоль Тозік, перадае БЕЛТА.**

«Пытанне павышэння ўзросту выхаду на пенсію — і такая пазіцыя кіраўніка дзяржавы — у практычнай плоскасці не стаіць і не абмяркоўваецца», — сказаў віцэ-прэм'ер. Ён нагадаў, што ўказам прадастаўлена магчымасць грамадзянам добраахвотна адкласці выхад на пенсію пасля дасягнення агульнаўстаноўленага пенсійнага ўзросту. Пры гэтым выбар застаецца за чалавекам: прадоўжыць работу без атрымання пенсіі, каб павялічыць памер сваёй пенсіі ў будучым, ці не карыстацца гэтай магчымасцю. Анатоль Тозік падкрэсліў, што пенсіі ў Беларусі выплачваюцца своечасова, у поўным аб'ёме, рэгулярна павышаюцца. Так, у гэтым годзе ў адпаведнасці з указам прадугледжана чатыры пераразлікі працоўных пенсій у сувязі з ростам заработнай платы. Павышэнне памеру пенсійных выплат адбылося з лютага і мая гэтага года, чакаецца пераразлік са жніўня і лістапада.

НАВІНЫ

## БЯСПЛАТНЫЯ ЗВАНКІ ДЛЯ ВЕТЭРАНАЎ

**У Дзень Перамогі ўдзельнікі Вялікай Айчыннай вайны атрымаюць магчымасць бясплатных тэлефонных размоў у межах краіны. Традыцыйны падарунак зробіць ветэранам РУП «Белтэлекам». Акцыя распачнецца ў 0.00 гадзін 9 мая і будзе доўжыцца да поўначы.**

Бясплатныя тэлефонныя званкі можна будзе зрабіць як з хатніх тэлефонаў удзельнікаў вайны, так і з аддзяленняў сувязі, тэлефонаў шпіталяў, а таксама з тэлефонаў у сэрвісных пунктах «Белтэлекам». Заказаць бясплатныя тэлефонныя размовы ўнутры краіны з дапамогай тэлефаніста ва ўсіх гарадах і абласцях можна будзе па нумарах 8-18 (для абанентаў Брэста і Брэсцкай вобласці, Віцебска і Віцебскай вобласці, Мінска і Мінскай вобласці, Магілёва і Магілёўскай вобласці) і 8-13 (для абанентаў Гомеля і Гомельскай вобласці, Гродна і Гродзенскай вобласці, а таксама Мінска і Мінскай вобласці).

Дадатковая інфармацыя па арганізацыі бясплатных міжгародніх тэлефонных размоў будзе прадастаўляцца па тэлефонах адзінай даведачна-інфармацыйнай службы 153 і 130.

**Надзея НІКАЛАЕВА.**

## ЗА БУЙНУЮ ПАРТЫЮ НАРКОТЫКАЎ — 13 ГАДОЎ

**На 13 гадоў пазбаўлення волі асуджаны грамадзянін Таджыкістана, затрыманы напрыканцы 2010 года ў Гомелі падчас перавозкі буйной партыі наркотыкаў — каля 4 кг гераіну і 1 кг гашышу.**

Паводле інфармацыі УКДБ па Гомельскай вобласці, Беларусь з'яўлялася транзітным пунктам у ланцугу Афганістан — Таджыкістан — Расія — Беларусь — краіны Еўрасаюза. Рэалізаваць наркотык планавалася ў краінах Балтыі. Наркакур'ер раней быў не толькі судзімы за асабліва цяжкія, у тым ліку гвалтоўныя злачынствы на тэрыторыі краін СНД, але і знаходзіўся ў міжнародным вышуку.

**Святлана БАРЫСЕНКА.**

ПАДЗЕІ

## ВЫРАТАВАЎСЯ І... ЗБЕГ

**У Брэсце дзесяцігадовы хлопчык захрас у кратах.**

Як расказаў карэспандэнту «Звязды» прэс-сакратар Брэсцкага абласнога ўпраўлення МНС Сяргей Машноў, у службу выратавання патэлефанаваў мужчына, які паведаміў, што непадалёк ад сталовай вагоннага дэпо дзіця не можа выбрацца з ахоўных кратаў, паміж прутамі якіх заціснула яго нагу. Выратавалі малога з дапамогай спецыяльнага гідраўлічнага інструмента: краты давялося расцягнуць і дастаць з «палону» нагу хлопчыка. Пасля таго, як урачы агледзелі малога і ўпэўніліся, што ніякіх наступстваў для здароўя кантакт з кратамі не прынёс, яго адпусцілі дахаты. Ці то ад перажытага стрэсу, ці то ад зноў набытай свабоды руху хлопчык так імкліва знік з месца здарэння, што даведацца, чыё гэта дзіця і як яно здолела прасунуць нагу ў вузкі праём, выратавальнікі не паспелі.

**Ганна ГАРУСТОВІЧ.**

ФАКТЫ

## АЛЮМІНІЕВАЯ «БУЛЬБА»

**Буйная партыя каляровага металу перавозілася... пад выглядам бульбы. Кантрабанду затрымалі супрацоўнікі ўпраўлення Дэпартамента фінансавых расследаванняў КДК Магілёўскай вобласці разам з міліцыяй.**

На дарозе каля вёскі Слабада Бабруйскага раёна спынілі «МАЗ», якім кіраваў 28-гадовы жыхар Баранавічаў. Вадзіцель прад'явіў дакументы на перавозку партыі бульбы з Івацэвіцкага раёна ў Валгаград. Аднак законнасць папер выклікала ў праваахоўнікаў сумненні. Тым больш што ў аўтамабіль было загружана толькі каля тоны бульбы замест 18 дазволеных. Затое за мяхамі знайшлі 25 тон алюмінію на суму 450 мільёнаў рублёў.

— Суправаджальных дакументаў з дазволам на нарыхтоўку металу, яго захоўванне і транспарціроўку не было, — пракаментаваў **начальнік арганізацыйна-інспектарскага аддзела УДФР КДК Магілёўскай вобласці Аляксандр ШАРОЙКІН**. — Каляровы метал прызначаўся для нелегальнага вывазу ў Расію. Парушальніку пагражае штраф да 100 базавых велічынь і канфіскацыя металу.

**Ілона ІВАНОВА.**

# ПРАЗ ФІНСКІ ЗАЛІЎ — КАБ ЗЛАВІЦЬ ПТУШКУ ЎДАЧЫ

Спецыяльны карэспандэнт «Звязды» перадае з Фінляндыі

**Учора ў Хельсінкі і Стакгольме стартаваў чарговы, 76-ы чэмпіянат свету па хакеі. У шведскай сталіцы на папярэднім этапе, акрамя гаспадароў, паміж сабой згуляюць каманды Расіі, Чэхіі, Германіі, Латвіі, Нарвегіі, Даніі і Італіі. Беларуская дружына на беразе Фінскага заліва будзе спрабаваць злавіць птушку ўдачы ў складзе «вялікай васьмёркі» — зборных Фінляндыі, Канады, ЗША, Швейцарыі, Славакіі, Францыі і Казахстана. Прычым у самым прамым сэнсе, бо талісманам цяперашняга сусветнага першынства з'яўляецца Angry Birds — цацачная птушка з камп'ютарнай гульні.**

Па раскладзе спаборніцтваў, беларусы стартавалі матчам з чэмпіёнамі свету — камандай Фінляндыі. Праўда, гульня пачалася ў 20.15 па мясцовым часе, які супадае з беларускім, і завяршылася позна ўвечары, калі газета ўжо даўно была падпісана да друку. Аб тым, якія ўражанні пакінуць падначаленыя Кары Хейкеля супраць каманды «Суомі», паведамім у наступным нумары. Пакуль жа тое, што папярэднічала стартаваму свістку на самай вялікай у Фінляндыі хакейнай пляцоўцы «Хартвал Арэна», якая ўмяшчае 13 500 гледачоў.

Дабірацца на машыне да Хельсінкі — гэта варыянт далёка не самы прымальны, асабліва калі ўлічыць, што можа чакаць на выездзе з беларускай мяжы. У чарзе можна прастаяць 5-6 гадзін. Але ж у нашым выпадку абмяркоўваць транспартную праблему не спатрэбілася. Журналіст «Звязды» разам з калегам-фотакарэспандэнтам, што называецца, напрасіліся на борт аўтамабіля Юрыя Грабоўскага — бацькі форварда «Таронта» Міхаіла Грабоўскага, які сёлета стаў лепшым бамбардзірам Нацыянальнай хакейнай лігі. Адпраўленне з Мінска запланавана амаль апоўначы. На выпадак, каб да раніцы прайсці мяжу на прапускным пункце Каменны Лог, што ў вільнюскім напрамку, і раніцай рухацца ў кірунку Таліна, адкуль да Хельсінкі — на пароме. На навігатары белага «Паршэ Каена» была зафіксавана спалучэнне лічбаў 876 — кіламетраж да канечнага пункта прызначэння.

Як аказалася, усё не так страшна. Дзякуючы садзеянню кіраўніцтва пагранкамітэта Беларусі нашу мяжу ўдалося перасячы за лічаныя хвіліны. На дзіва, літоўскія пагранічнікі і мытнікі не «выкручвалі рукі» беларускаму экіпажу за тое, што багажны адсек іншамаркі быў запоўнены сумкамі і пакетамі, а ў салоне знайшлі свае месца з дзясятак хакейных клюшак і белы шлем пад нумарам 84. Зрэшты, і «Паршэ» Грабоўскіх, штурманам якога выступіў дзядуля Аляксандр Кузьміч (ён ужо даўно разменяў восьмы дзесятак), меў дзяржнумар **00 84**. Аматары хакея ведаюць, што гэтыя магічныя лічбы — год нараджэння Мішы Грабоўскага. Навошта столькі клюшак, пытаюся ў гаспадара машыны. Няўжо ў Беларускай федэрацыі хакея для нацыянальнай зборнай не хапае спартыўнага інвентару? Усё, аказваецца, проста. Пра дэфіцыт клюшак сцвярджаць не бяруся, сказаў Юрый Аляксандравіч, а вось тое, што Міша заўсёды іх прывозіць з «Таронта» — факт. Відавочна, што ў прафесіяналаў свае звычкі. Тут вельмі важна, каб «прылада працы» была падагнана пад чалавека. Каб вугал крука быў адпаведным, а вага клюшкі — прывычнай. Хацелася спадзявацца, што гэты каштоўны груз, частка якога прызначалася і для форварда «Салавата Юлаева» Канстанціна Кальцова, саслужыць добрую службу асноўным на сёння ігракам беларускай зборнай, якая адправілася ў Хельсінкі з Браціславы яшчэ 2 мая. А мы — за імі наўздагон. Пагранічныя пункты Літвы, Латвіі і Эстоніі мяняліся разам са змяненнем лічбаў на навігатары. І ўжо на ўездзе ў Талін, калі на экране высвецілася лічба 90, стала зразумела, што мы едзем з летняга беларускага надвор'я ў раннюю вясну. Бо ў марскім порце эстонскай сталіцы, адкуль нам давялося пагрузіцца на гіганцкі паром (37 еўра за дзве гадзіны пераправы на другі бераг) веяла сапраўднай прахаладай. Давялося тэрмінова лезці па курткі, якія яшчэ больш спатрэбіліся на борце гіганцкай махіны. Гэта калі ты знаходзішся на верхняй палубе на адкрытым паверсе. Але ж абсалютная большасць пасажыраў (у тым ліку і тыя, што пакінулі свае аўтамабілі на ніжнім узроўні марскога лайнера) бавіла свой час унутры плавучага монстра, дзе можна не толькі адпачыць на канапе ці пасядзець за столікам, але і зрабіць экскурсію па велізарнай гандлёвай зале, дзе вялікі выбар прадуктаў харчавання і спіртнога. Дарэчы, сярод шматлікай фінскай «дыяспары» гэтага рэйса — абсалютную большасць чэмпіянат свету па хакеі апошняе мала цікавіць. А вось тое, што «цэннік» на віскі, каньякі,




шампанскае і іншы алкагольны асартымент на эстонскім беразе на парадак ніжэй, яны ведаюць цудоўна. Таму і імкнуцца бедныя фіны закупіцца адпаведным таварам, што называецца, пра запас. Які ж там хакей?!

Гадзінай пазней, ацаніўшы выгоды цывілізацыі — спальнае месца, душ і сняданак са шчодрага «шведскага стала», чаго кожнаму турысту не хапае ў дарозе ў салоне аўтамабіля, асабліва на вузкіх вулачках Хельсінкі, дзе практычна адсутнічаюць паркавачныя месцы і ў многіх месцах дарожны рух арганізаваны ў адзін бок, мы ў якасці пароля назвалі чэмпіянат свету па хакеі. У імгненне дзяўчына з «рэцэпшэна» адкрыла карту горада і намалявала ручкай маршрут у другі канец сталіцы. А калі даведалася, што беларускія журналісты збіраюцца прайсці «пракладзены» маршрут пешшу — толькі ўсміхнулася. Маўляў, і наколькі вас хопіць з велізарнымі рукзакамі, каб адмераць 7 кіламетраў запаветнага шляху да хакейнай «Хартвал Арэны»? Вам бы на таксі. Але ж наша мэта — забіць двух зайцоў. Не за шклом аўтамабіля ці аўтобуса азнаёміцца з горадам. І не менш важна — зэканоміць 40-50 еўра.

У першы ж працоўны дзень у прэс-цэнтры арэны арганізатары хакейнага першынства з улікам папулярнасці нацыянальнай зборнай Фінляндыі і вялікай колькасці мясцовых журналістаў удвая павялічылі таксу за карыстанне інтэрнэтам WiFi з 50 еўра да 100. Але ж з улікам стартавага вячэрняга матча дзейных чэмпіёнаў свету попыт на інтэрнэт-карткі з боку журналістаў быў высокі. Што называецца, інфармацыю — у масы. Мы за цаной не пастаім.

**Уладзімір ЗДАНОВІЧ.** *Хельсінкі.*

## ЛЯСНЫ АРСЕНАЛ

Паблізу вёскі Макарава Віцебскага раёна ў лесе знайшлі 19 мінамётных мін, 33 артылерыйскія снарады і 36 узрывальнікаў часоў Вялікай Айчыннай вайны. Небяспечныя знаходкі былі абясшкоджаны групай размініравання.

**Аляксандр ПУКШАНСКІ.**

## АБЗАЦ

◢ **Сярэднеўзважаны кошт 1 кв.м жылля, пабудаванага для грамадзян, якія маюць патрэбу ў паляпшэнні жыллёвых умоў, з выкарыстаннем дзяржпадтрымкі, у першым квартале 2012 года склаў у цэлым па Беларусі каля Br2,6 млн, з улікам аддзелачных работ — больш як Br2,9 млн.**

◢ Аператыўныя работнікі Брэсцкай памежнай групы сумесна з мытнікамі затрымалі мікрааўтобус з партыяй цяляціны, нелегальна ўвезенай з Украіны. У салоне аўто знойдзены тушы цялят агульнай вагой 1,5 тоны, на якія кіроўца не змог прад'явіць неабходныя дакументы. Вядзецца праверка.

## ПОЎНЫ АБЗАЦ

◢ **У Чэхіі выкралі сталёвы пешаходны мост вагой 10 тон. Як паведамляюць мясцовыя СМІ, паліцэйскія ўстанавілі асобы зладзеяў. Вядзецца расследаванне. Зламыснікі дэмантавалі мост з дапамогай пад'ёмнага крана. Акрамя таго, яны выкралі каля 200 метраў чыгуначных рэек, над якімі размяшчаўся мост. Злачынцы далі паліцэйскім падробленыя дакументы, заявіўшы, што на месцы дэмантаваных рэек будуць пракладзены веласіпедныя дарожкі.**

*Паводле паведамленняў карэспандэнтаў «Звязды» і інфармагенцтваў.*

# ЗНІШЧАНА «САМАГОННАЕ МОРА»

**На тэрыторыі вёскі Боркі Маладзечанскага раёна выяўлены і знішчаны буйнейшы ў краіне стацыянарны завод па вытворчасці самагону. Вага канфіскаванага абсталявання і ёмістасцяў склала больш за 10 тон. У гаспадарчых пабудовах прыватнага дома знойдзена 20,6 тоны брагі і 880 літраў гатовага да рэалізацыі самагону.**



— Непасрэдна нелегальнай яго вытворчасцю займаліся некалькі так званых «батракоў» — нідзе афіцыйна не працуючых грамадзян, — паведамілі «Звяздзе» ў аддзяленні інфармацыі і грамадскіх сувязяў УУС Мінаблвыканкама. — Устаноўлена ўладальніца міні-завода — мясцовая жыхарка 1958 года нараджэння. У адносінах да яе складзены пратаколы па фактах шэрагу парушэнняў Адміністрацыйнага кодэкса — у прыватнасці, за незаконны выраб і захаванне самагоннага апарата, брагі і самагону, парушэнне правілаў проціпажарнай бяспекі, правілаў утрымання населеных пунктаў і інш. Лёс жанчыны цяпер будзе вырашаць суд Маладзечанскага раёна, аднак штраф складзе не менш за 10 мільёнаў рублёў.

Згодна з папярэдняй інфармацыяй, самагон з міні-завода пастаўляўся на больш чым 30 «самагонных кропак» у Маладзечанскім, Валожынскім, Смаргонскім і іншых раёнах. Зараз працягваюцца мерапрыемствы па ўстанаўленні каналаў рэалізацыі сурагатнага спіртнога напою. Аднак ужо цяпер у праваахоўных органах канстатуюць: найбольш важным вынікам праведзенай аперацыі стала знішчэнне аптовага пастаўшчыка нелегальнага алкаголю на тэрыторыі некалькіх раёнаў. Дарэчы, незаконная вытворчасць самагону ў падобных маштабах выяўлялася на тэрыторыі краіны 5 гадоў таму і таксама ў Маладзечанскім раёне, калі ў лясным масіве паблізу Клачкова быў знішчаны самагонны апарат з 50 тонамі брагі.

**Сяргей РАСОЛЬКА, Святлана БАРЫСЕНКА.**




ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ АУКЦИОНА

**Государственное предприятие «Минский областной центр инвестиций и приватизации» (организатор аукциона) по поручению Пуховичского райпо (продавец) проводит повторный открытый аукцион по продаже:**

**Лот № 1:** 89/125 доли в праве собственности на здание торгового центра с общежитием (инв. № 602/С-41059), об. пл. 2052,4 кв.м, расположенного по адресу: **Минская область, Пуховичский район, аг. Блонь, ул. Центральная, д. 112. Начальная цена с НДС – 550 000 000 бел. руб.** Площадь земельного участка – **0,2962 га** (продавцу предоставлена доля в праве аренды земельного участка (0,2109 га) по 27.01.2039. Ограничения: водоохранная зона реки Титовка.) Объект обременен договором аренды (32 кв.м по 21.06.2013).

**Лот № 2:** здание магазина (инв. № 602/С-44082), об. пл. 77,1 кв.м, **Минская область, Пуховичский район, Дричинский с/с, д. Белое, 41. Начальная цена с НДС – 28 483 000 бел.руб.** Площадь земельного участка – 0,0350 га (право аренды по 12.01.2021).

Задаток **10%** от начальной цены перечисляется на **р/с № 3012108260016 в ЦБУ № 701 ОАО «БПС-Сбербанк», БИК 153001369, г. Минск, УНП 690324015,** Государственное предприятие «Минский областной центр инвестиций и приватизации».

Договор купли-продажи должен быть подписан в течение 5 (пяти) рабочих дней после проведения аукциона. Оплата за объект производится в течение 30 (тридцати) банковских дней со дня проведения аукциона, если иное не предусмотрено договором купли-продажи.

Порядок проведения аукциона и оформления участия в торгах оговорен в условиях его проведения, размещенных на сайте организатора торгов **www.rlt.by.**

*Предыдущее извещение о проведении торгов опубликовано в газете «Звязда» от 22.11.2011.*

Аукцион состоится **07.06.2012** в 11.30 по адресу: г. Минск, ул. Чкалова, 5, каб. 324. Заявления на участие и необходимые документы принимаются по **06.06.2012** до 17.00 по указанному адресу.

**Тел.: (8017) 224 61 34; 500 47 12.**

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ АУКЦИОНА

**Государственное предприятие «Минский областной центр инвестиций и приватизации» (организатор аукциона) по поручению Пуховичского райпо (продавец)**

проводит повторный открытый аукцион по продаже **одним лотом** объектов недвижимого имущества, расположенных по адресу: **Минская область, Пуховичский район, г. Марьина Горка, ул. Гучка, д. 123,** в составе: **здание рыбо-колбасного цеха** (инв. № 602/С-22152), об. пл. 923,4 кв.м.; **навес РКЦ** (инв. № 602/С-43157), об.пл. 155,2 кв.м. (ул. Гучка, д. 123/3); **склад-гараж** (602/С-43155), об.пл. 125,8 кв.м (ул. Гучка, д. 123/5); **гараж РКЦ** (инв. № 602/С-43154), об. пл. 107,3 кв.м (ул. Гучка, д. 123/2); **мастерская РКЦ** (инв. № 602/С-43153), об. пл. 84,3 кв.м (ул. Гучка, д. 123/4); **проходная колбасного цеха РКЦ** (инв. № 602/С43156), об. пл. 14,8 кв.м (ул. Гучка, д. 123/1).

**Начальная цена с НДС (снижена) – 1 000 000 000 бел. руб.** Площадь земельного участка – **0,9173 га** (предоставлен продавцу **на праве аренды** по 11.11.2040).

Задаток **10%** от начальной цены перечисляется на **р/с № 3012108260016 в ЦБУ № 701 ОАО «БПС-Сбербанк», БИК 153001369, г. Минск, УНП 690324015,** Государственное предприятие «Минский областной центр инвестиций и приватизации».

Договор купли-продажи должен быть подписан в течение 5 (пяти) рабочих дней после проведения аукциона. Оплата за объект производится в течение 30 (тридцати) банковских дней со дня проведения аукциона, если иное не предусмотрено договором купли-продажи.

Порядок проведения аукциона и оформления участия в торгах оговорен в условиях его проведения, размещенных на сайте организатора торгов **www.rlt.by.**

*Предыдущее извещение о проведении торгов опубликовано в газете «Звязда» от 22.11.2011.*

Аукцион состоится **07.06.2012 в 11.00** по адресу: г. Минск, ул. Чкалова, 5, каб. 324. Заявления на участие и необходимые документы принимаются по **06.06.2012** до 17.00 по указанному адресу.

**Тел.: (8017) 224 61 34; 500 47 12.**

Станіслаў БУКО:

# «ЛЮДСКІЯ ПРАБЛЕМЫ ТРЭБА РАЗГЛЯДАЦЬ, БЫЦЦАМ СВАЕ АСАБІСТЫЯ»

**Начальнік упраўлення па рабоце са зваротамі грамадзян і юрыдычных асоб Адміністрацыі Прэзідэнта штосераду выслухоўвае па некалькі дзясяткаў нечым не задаволеных людзей. Я ж запісалася на прыём да Станіслава Буко, каб задаць некалькі неасабістых пытанняў.**



## «Хапаюцца за Прэзідэнта, як за апошнюю выратавальную нітачку»

**— Станіслаў Іосіфавіч, а ці шмат сярод вашых заяўнікаў тых, якіх турбуюць грамадскія праблемы?**

— Няшмат. Асабістыя праблемы нашых людзей хвалююць значна больш. Адзінкі ў сваіх лістах даюць ацэнку палітычным падзеям, прапаноўваюць унесці змены ў заканадаўства. Звяртаюцца і з іншымі просьбамі. Так, неабыякавыя жыхары Слоніма прасілі не даць мясцовым чыноўнікам знішчыць лесапаркавую зону горада. Яны не разумелі, як можна высекчы малады лес дзеля 10 катэджаў. У рэшце рэшт Гродзенскі аблвыканкам адмяніў сваё рашэнне.

**— Ці часта беларусы звяртаюцца ў Адміністрацыю Прэзідэнта? Які працэнт скаргаў прызнаецца абгрунтаваным?**

— Да нас, як правіла, звяртаюцца людзі, якія прайшлі са сваёй скаргай усе магчымыя інстанцыі. Яны атрымалі адказы, якімі не задаволены, таму хапаюцца за Прэзідэнта, як за апошнюю выратавальную нітачку. Ёсць і такія, якія адразу ж звяртаюцца ў Адміністрацыю. Маўляў, «што тая мясцовая ўлада, вось напішу Прэзідэнту, ён мае пытанне імгненна вырашыць». Але ж мы адсюль не бачым, што там робіцца на месцах. Таму большасць скаргаў перанакіроўваем для разгляду кампетэнтным органам і ставім вырашэнне справы на кантроль. У першым квартале гэтага года мы атрымалі амаль 7 тысяч зваротаў, рашэнне па 23 % з якіх трымалі на кантролі. Ужо сёння па 18 % з іх прынятае станоўчае рашэнне, па 67 % дадзены тлумачэнні, астатнія ж прызнаны неабгрунтаванымі.

**— А як кантралюеце мясцовых чыноўнікаў з Мінска?**

— Кожную справаздачу мясцовай улады аналізуем. Калі ўзнікаюць нейкія сумненні, то звязваемся непасрэдна з заяўнікам, каб удакладніць, ці задаволены ён, як вырашылі яго праблему. Калі трэба, з праверкай на месца выязджае міжведамасная рабочая група. Вось зусім свежы прыклад. Па выніках паездкі ў Брэсцкую вобласць Прэзідэнт даручыў вывучыць прапановы і звароты жыхароў аграгарадка Альшаны Столінскага раёна. У бліжэйшы час міжведамасная камісія, якая ўжо створана, выедзе на месца і затым праінфармуе кіраўніка дзяржавы аб выніках. У цэлым найбольш поўны кантроль за работай мясцовых чыноўнікаў са зваротамі грамадзян ажыццяўляецца падчас рэспубліканскага маніторынгу.

**— Апошні праводзіцца ў нашай краіне з 2010 года. Як вы можаце ацаніць эфектыўнасць гэтага дастаткова новага віду кантролю?**

— Магу з упэўненасцю сказаць, што ўзровень работы дзяржорганаў са зваротамі грамадзян за апошнія гады значна павысіўся. У тым ліку і дзякуючы маніторынгу. Аб гэтым сведчыць у тым ліку і тое, што колькасць скаргаў за тры месяцы гэтага года ў параўнанні з аналагічным перыядам мінулага знізілася на 10,5%.

## «Лісты, напісаныя ад рукі, даводзіцца чытаць з лупай»

**— Наколькі запатрабаваны электронны від звароту?**

— Кожны трэці зварот, які паступіў сёлета ў Адміністрацыю Прэзідэнта, электронны. І з кожным днём колькасць іх павялічваецца. Такая тэндэнцыя сведчыць аб павышэнні адукацыйнага, інтэлектуальнага і маёмаснага ўзроўню людзей. І гэта нас радуе. Акрамя таго, электронная форма звароту эканоміць не толькі час і сродкі скаржнікаў, але і зрок нашых супрацоўнікаў, бо многія лісты, напісаныя ад рукі, даводзіцца чытаць з лупай.

**— Ці можна размежаваць звароты па рэгіёнах? Ёсць нейкія геаграфічныя асаблівасці?**

— Безумоўна, тэматыка лістоў адрозніваецца. Напрыклад, палешукоў хвалююць пераважна пытанні паводак і ў той жа час атрымання прыдатных для сельскай гаспадаркі зямельных участкаў. Так, летась шматдзетныя сем'і Столінскага раёна неаднаразова прасілі дадаткова выдзеліць ім зямлю. І мясцовыя ўлады ў рэшце рэшт пайшлі насустрач сем'ям, якія маюць 5 і больш дзяцей: прадаставілі ім участкі з разліку па 0,1 га на адно дзіця. Істотна адрозніваюцца ад іншых рэгіёнаў рэспублікі і праблемы мінчан, ад якіх штогод паступае больш за ўсё зваротаў.

**— І што гэта за праблемы? Удакладніце, калі ласка.**

— Найбольш характэрныя — гэта ўшчыльненне існуючай забудовы, знос жылля і адсяленне ўласнікаў. Так, у сувязі з будаўніцтвам метро і рэканструкцыяй праспекта Дзяржынскага многія жылыя дамы пайшлі пад знос. Гэты працэс праходзіць дастаткова хваравіта. Людзі не заўсёды задаволены раёнам горада, куды іх адсяляюць, кампенсацыяй за знесены дом і насаджэнні. Ведаеце, у нас нялёгкая праца, бо незадаволеныя былі і заўсёды будуць. Вось вам паказальная сітуацыя. Ва Уруччы паміж шматпавярховымі дамамі вырашылі пабудаваць яшчэ адзін жылы дом. Тамтэйшыя жыхары сабралі тры тысячы подпісаў супраць будаўніцтва і некалькі тыдняў таму прыйшлі на прыём да кіраўніка Адміністрацыі Прэзідэнта. Па даручэнні Уладзіміра Макея створана камісія, якая цяпер вывучае гэтае пытанне. У Магілёве іншая сітуацыя. Пачалі будаваць дом. Незадаволеныя жыльцы тут жа звярнуліся са скаргамі ва ўсе органы. Калі мясцовая ўлада адмяніла будаўніцтва, пачалі абурацца тыя, хто будаваўся. Маўляў, «мы затрацілі на праектныя работы грошы». Дайшло да таго, што апошнія падалі іск у суд, які іх падтрымаў, бо ўзвядзенне новага дома, як высветлілася, не супярэчыць будаўнічым нормам.

**— Якія рашэнні прымаюцца па выніках зваротаў?**

— Самыя розныя — ад станоўчага рашэння праблемы да адмовы разгляду звароту. Пры гэтым аднолькава адказна ставімся як да маленькай праблемы аднаго чалавека, так і да сур'ёзных калектыўных зваротаў. Прывяду некалькі самых свежых прыкладаў задаволеных скаргаў. У лютым у Адміністрацыю Прэзідэнта напісалі жыхары мікрараёна «Усходні». Заяўнікі скардзіліся на тое, што за апошнія 16 гадоў у мікрараёне пабудавана больш за 30 шматпавярховых дамоў і ніводнага дзіцячага садка і школы. Больш за тое, на адным з зямельных участкаў, выдзеленым пад будаўніцтва садка з басейнам, пачалося будаўніцтва 25-павярховага жылога дома. Мінгарвыканкам па даручэнні кіраўніцтва Адміністрацыі разгледзеў гэты зварот і адмяніў рашэнне аб будаўніцтве. Дзіцячы садок пачнуць будаваць на тым месцы ўжо сёлета. Больш за 1000 мінчан пратэставалі таксама ў лютым супраць будаўніцтва на тэрыторыі сквера па вуліцы Заслаўскай 15-павярховага офіса і 4-павярховага банка з наземнай аўтастаянкай. Мы даручылі Мінгарвыканкаму разгледзець гэтую скаргу. У выніку будаўніцтва офіса і банка там прызналі немэтазгодным. Дамагліся і пераразліку платы за жыллёва-камунальныя паслугі жыльцоў інтэрната па вуліцы Кірава ў Калінкавічах. Раней плата з іх бралася як з юрыдычных асоб і даходзіла да 830-900 тысяч рублёў за месяц.

## «Вы дайце каманду, каб мяне не выкідвалі з маршрутак»

**— Самая недарэчная скарга ў вашай практыцы?**

— Калі мы выязджаем у рэгіён, то вядзём там прыём па жывой чарзе. У Брэсце, памятаю, прыйшла адна жанчына і кажа: «Я інвалід, езджу на гарадскім транспарце па пасведчанні бясплатна. Вы дайце каманду, каб мяне не выкідвалі з маршрутных таксі. Я паказваю кіроўцу пасведчанне, а ён патрабуе плату за праезд. Я кажу, што не буду плаціць, бо ў мяне ёсць пасведчанне. Ён мяне за шкірку — і выкідвае». Час прыёму, як правіла, абмежаваны, і можна было б прыняць чалавека з рэальнай праблемай. Але ж на лбе не напісана, хто з якім пытаннем прыйшоў... Што тычыцца пісьмовых зваротаў, то сярод іх таксама хапае недарэчнасцяў. Так, жанчына са Шчучына накіравала 28 паведамленняў у апарат Савета Міністраў, 51 раз звярнулася ў Адміністрацыю Прэзідэнта. Яна просіць адмяніць завяшчанне сястры на кватэру бацькоў, якое тая яшчэ не пісала (!).

**— Колькі ў рэспубліцы налічваецца людзей, якіх можна смела залічыць да катэгорыі прафесійных скаржнікаў?**

— Ёсць людзі, якія пішуць на працягу многіх гадоў па розных пытаннях, указваюць дробныя недахопы ў рабоце мясцовых органаў улады, выказваюць дзівацкія ідэі і прапановы. Так, адзін мінчанін прыслаў за апошнія 8 гадоў больш як 80 паведамленняў. Пастаянна прапаноўвае завоблачныя праекты — стварэнне новых тыпаў ракет, паштоўкі для стасункаў з уладай. Прадстаўляецца віцэ-прэзідэнтам, рэктарам-прэзідэнтам Акадэміі самакіравання, вядзе сябе неадэкватна. Разам з тым назваць пастаянна дзеючых персанажаў, якія ідуць да нас у прыёмную як на працу, прафесійнымі скаржнікамі — з майго боку, неэтычна. Такую выснову можна зрабіць толькі пасля таго, як суд прыцягне такога чалавека да адказнасці за бясконцыя неабгрунтаваныя звароты.

**— Што рабіць заяўніку, калі яго не задавальняе адказ па яго звароце ў Адміністрацыю Прэзідэнта?**

— Адказ можна абскардзіць у суд у вызначаным заканадаўствам парадку.

**— Якія недахопы вы бачыце ў рабоце мясцовай улады? Што трэба зрабіць, на ваш погляд, для таго, каб зменшылася колькасць скаргаў?**

— Трэба проста любіць людзей. Разглядаць іх праблемы, быццам яны твае асабістыя. І трэба сказаць, сярод чыноўнікаў нямала такіх, якія з душой ставяцца да чужых праблем. Але ж ёсць і такія, якім, як у народзе кажуць, да ліхтара. Таксама, што хаваць, у кіраўніка райвыканкама вельмі вялікая занятасць. Але ўсе чамусьці хочуць трапіць на прыём менавіта да яго. Калі паглядзім статыстыку, то ўбачым, што за год адзін старшыня прымае ў некалькі разоў больш людзей, чым усе яго намеснікі. Дык гэта няправільна. Хочацца звярнуцца да вашых чытачоў, каб яны не чакалі месяцамі сваёй чаргі трапіць непасрэдна да кіраўніка, а ішлі да намеснікаў, якія вядуць кожны свой кірунак. І тады б нашмат хутчэй вырашаліся многія пытанні. А пакуль, на жаль, нярэдка менавіта зварот у Адміністрацыю Прэзідэнта дазваляе паскорана вырашыць надзённыя праблемы, якія на месцах не заўсёды вырашаюцца аператыўна.

### Ад аўтара.

***Шаноўныя чытачы, дзяліцеся сваім удалым альбо няўдалым вопытам стасункаў з мясцовымі органамі ўлады. А мы, у сваю чаргу, будзем разам з упраўленнем па рабоце са зваротамі грамадзян і юрыдычных асоб Адміністрацыі Прэзідэнта, па магчымасці, спрыяць аднаўленню справядлівасці.***

**Надзея ДРЫЛА, фота аўтара.**

**РЭЙТЫНГ СКАРГАЎ-2012:**
**ЯКІЯ ПРАБЛЕМЫ ХВАЛЮЮЦЬ БЕЛАРУСАЎ БОЛЬШ ЗА ЎСЁ?**

**1 МЕСЦА — пытанні жыллёва-камунальнай гаспадаркі (пераважна паляпшэнне жыллёвых умоў, рамонт і эксплуатацыя жылля);**
**2 МЕСЦА — пытанні будаўніцтва жылля (калектыўнае жыллёвае будаўніцтва, дзяржаўная палітыка ў галіне жыллёвага будаўніцтва);**
**3 МЕСЦА — пытанні судоў (перагляд судовых прыгавораў і рашэнняў, памілаванне і амністыя);**
**4 МЕСЦА — пытанні сацыяльнага забеспячэння;**
**5 МЕСЦА — пытанні органаў унутраных спраў.**

# Працяг размовы: ЦІ З'ЯВІЦЦА Ў БЕЛАРУСІ ДЗЕНЬ ПАРТЫЗАНАЎ І ПАДПОЛЬШЧЫКАЎ?

**У рэдакцыю працягваюць паступаць водгукі на матэрыялы «круглага стала» «Векапомныя дні: фронт у тыле ворага» за 24 сакавіка 2012 года. Пісьмы чытачоў друкаваліся на старонках «Звязды» 5, 10, 17 красавіка. Сёння змяшчаем чарговую падборку.**

## Літаральна ўсе вяскоўцы былі звязаны з партызанамі

### ЛАГОЙСКІ САВЕТ ВЕТЭРАНАЎ АДЗІНАДУШНА ПАДТРЫМЛІВАЕ ПРАПАНОВУ «ЗВЯЗДЫ»

**Публікацыю «Векапомныя дні: фронт у тыле ворага», як і многія чытачы «Звязды», успрыняў з разуменнем і адабрэннем. Пара нарэшце аддаць усенародную даніну беларускім партызанам за іх самаахвярную барацьбу з гітлераўскімі захопнікамі. Зрабіць гэта трэба найперш дзеля таго, каб маладое пакаленне ведала праўду аб тых, хто ў неймаверна складаных умовах змагаўся ў тыле ворага, набліжаючы перамогу.**

Пра партызанаў як мужных абаронцаў Радзімы ў мяне склалася ўяўленне з маленства. Запомнілася, як у нашу хату-леснічоўку, што стаяла ў баку ад вёскі Жарамец Бярэзінскага раёна, яшчэ да прыходу немцаў зайшла група вайскоўцаў, савецкіх камандзіраў. Мяне тады ўразіла, што на грудзях аднаго з іх быў ордэн Леніна. Завіталі да нас невыпадкова: бацька наш быў партызанам, да вайны ўзначальваў сельсавецкую партарганізацыю. Маці падрыхтавала абед для камандзіраў-акружэнцаў, паклала на стол бохан хлеба.

Пазней мы даведаліся, што бацька наш устанавіў сувязь з тымі камандзірамі, якія мелі сховішча недзе ў бліжэйшым лесе. Аб'ездчык па роду заняткаў, ён прадбачліва сабраў па наваколлі нямала зброі. Сталася так, што ён трагічна загінуў, але не быў забыты тымі, дзеля каго пастараўся. У адну з зімовых начэй у хату патаемна зайшлі лясныя «госці», і я спрасонку чуў іх галасы: «Мамаша, мы знаем, что ваш муж спрятал где-то в лесу немало оружия. Скажите только, где оно, а мы отблагодарим». Маці чыстасардэчна прызналася ў сваім няведанні, бо бацька ўмеў захоўваць тайну. Тыя ж камандзіры, несумненна, засталіся на Бярэзіншчыне і сталі аднымі з арганізатараў усенароднай барацьбы супраць акупантаў.

Першага партызана давялося ўбачыць неўзабаве на пачатку вясны, калі ўранку ўгледзелі, як гарыць мост цераз рэчку паблізу хаты і на фоне агню — узброены чалавек і ягоны вокліч (як цяпер помню): «Горит партизанская война в тылу врага!».

Летам таго ж года на вясковай вуліцы з'явілася група конных партызанаў і сярод іх, на маё здзіўленне, хлапчук у пілотцы, пазначанай чырвонай стужкай. Гэта быў знаёмы мне Саша Ульянаў, мінскі школьнік, які пад восень сорак першага, страціўшы надзею дагнаць фронт, знайшоў прытулак у спагадлівых людзей з суседняй вёскі. Тут жа, на вуліцы, мы даведаліся, што юны партызан паспеў праявіць сябе, калі на шашы зрабілі засаду і падбілі легкавік, з якога выскачыў афіцэр і пачаў адстрэльвацца з укрыцця, Саша змог падабрацца да фашыста і знішчыў яго гранатай.

Наша асірацелая сям'я шмат чым абавязана партызанам. Каб адвесці пагрозу расправы (бацька ж быў камуністам), іх камандзіры строга прыгразілі нядобразычліўцам, магчымым даносчыкам, выручылі, калі сям'я аказалася без каня.

І яшчэ я хачу нагадаць пра такі паказальны факт. Зімой сорак трэцяга, у лютыя маразы, хлопцы і дзяўчаты з нашай вёскі, каб пазбегнуць адпраўкі ў Нямеччыну, вымушаны былі хавацца па лясах, грэліся каля вогнішчаў. Яны нярэдка былі пад аховай лясных байцоў, якія гатовы былі прыкрыць уцекачоў ад магчымага нападу ворагаў.

Жыццё маё склалася так, што пасля заканчэння БДУ болей за 50 гадоў жыву ў Лагойску. Па роду службы (работа ў рэдакцыі, мясцовым музеі) часта меў сустрэчы з партызанамі, пісаў пра іх. Мог бы прывесці шмат фактаў на карысць таго, што народныя абаронцы заслугоўваюць усеагульнага прызнання і ўшанавання. Адна з вуліц нашага райцэнтра носіць імя адважнай партызанкі, медсястры Надзеі Харчанкі. Яна праявіла самаахвярнасць, калі партызаны зрабілі спробу разгрому варожага гарнізона ў Лагойску. У крытычны момант бою Надзя не разгубілася, замяніўшы забітага кулямётчыка, працягвала весці агонь па ўмацаванні, пакуль не была смяротна паранена.

Народныя мсціўцы ў нашым краі мелі шырокую падтрымку з боку мясцовага насельніцтва. Я пабываў у невялікай вёсцы Бабры, што ў вайну аказалася ў буйной партызанскай зоне. Рыхтуючы матэрыял для газеты, быў уражаны тым, што літаральна ўсе вяскоўцы былі звязаны з партызанамі, дапамагалі ім: прымалі на начлег, пяклі хлеб, мылі адзенне, дзяліліся прадуктамі, у адной з хат быў нават палявы шпіталь. Тут жа, у Бабрах, мела сталы прытулак легендарная партызанская разведчыца, дачка венгерскага камуніста Таццяна Баўэр, якая раз за разам выпраўлялася на сувязь з мінскімі падпольшчыкамі, а вяртаючыся ў партызанскую зону, адпачывала, аднаўляла сілы ў добрых, спагадлівых людзей.

Мне выпала мець знаёмства з ветэранам вайны, былым франтавіком Міхаілам Грындзюшкам з вёскі Пушча, што па суседстве з Бягомльшчынай. Міхаіл Фёдаравіч расказваў, як ён падлеткам адвозіў параненых партызанаў на лясны аэрадром, адкуль іх адпраўлялі самалётам на Вялікую зямлю.

***Звяздоўская публікацыя «Векапомныя дні: фронт у тыле ворага» стала прадметам абмеркавання на пасяджэнні раённага савета ветэранаў, старшынёй якога я з'яўляюся. Рашэнне, якое стала вынікам зацікаўленай размовы, было прынята адзінадушна: падтрымаць пазіцыю, выкладзеную на старонках «Звязды». Што ж наконт даты ўсталявання Дня партызанаў і падпольшчыкаў, то найбольш прымальным здаецца дзень 20 мая. Адзін з аргументаў на карысць гэтай даты — прыродны фактар, абуджэнне прыроды, што немалаважна для правядзення розных масавых мерапрыемстваў.***

**Віктар НЕСЦЯРОВІЧ.**

*г. Лагойск.*

## ЛЕПШ ПОЗНА, ЧЫМ НІКОЛІ

**Падтрымліваю прапанову ўдзельнікаў арганізаванага рэдакцыяй газеты «Звязда» «круглага стала» аб усталяванні ў рэспубліцы Дня партызанаў (альбо Дня партызанскай славы).**

Пра баявыя справы беларускіх партызанаў, важкасць іх укладу ў перамогу над фашызмам шырока вядома ва ўсім свеце. Маштаб здзейсненага народнымі мсціўцамі ў імя свабоды і незалежнасці Радзімы не падлягае рэвізіі, як бы каму гэтага ні хацелася.

Я належу да пакалення дзяцей вайны. Памятаю, які шок, адчуванне безвыходнасці перажылі мае землякі, апынуўшыся літаральна праз лічаныя дні пасля пачатку вайны на акупаванай чужаземцамі тэрыторыі. Здавалася, настае канец свету. Дзе Чырвоная Армія? Дзе фронт? Што рабіць? Як жыць далей? Інфармацыйны вакуум, невядомасць, якія абрынуліся на насельніцтва, здольны былі паралізаваць волю, выклікалі адчай і разгубленасць.

І вось з'явіліся першыя партызаны. Перш за ўсё яны наладзілі на падставе зводак Саўінфармбюро інфармаванне мірных жыхароў пра становішча на франтах, пра баявыя аперацыі арміі і флоту, здзяйсненні працаўнікоў савецкага тылу. Усё гэта паднімала патрыятычны дух людзей, умацоўвала веру ў перамогу. Тысячы беларусаў уліліся ў партызанскія атрады, а тыя, што заставаліся жыць у сваіх населеных пунктах, сталі надзейнымі памочнікамі партызанаў, кармілі, апраналі, хавалі ад немцаў і паліцаяў. Масавае антыфашысцкае супраціўленне народа замацавала за Беларуссю пачэсную назву «Рэспубліка-партызанка».

Шкада, што ў нас няма Дня партызанаў, што ўпушчаны каштоўны час, калі многія ветэраны былі яшчэ жывыя.

Але, як той казаў, лепш позна, чым ніколі. Давайце назаўсёды ўпішам гэты Дзень у гісторыю Беларусі, пакінем яго ў спадчыну нашчадкам.

**Ганна ЛАЗОЎСКАЯ, ветэран працы.**

# Сувязь з масамі

95 ЗВЯЗДА

### Спадарожнікі

«Спадарожнікі», яны ж «шчупальцы газеты на фабрыках і заводах» і «рыцары рабочага пяра» — гэта рабкары. Менавіта такія параўнанні можна сустрэць на старонках «Звязды» 20-х гадоў. Рабкары не проста дасылалі асобныя заметкі: добрая доля газетнай плошчы таго часу занятая менавіта іх тэкстамі. Меркаванні «спадарожнікаў» улічваліся штатнымі супрацоўнікамі. Газета вяла сур'ёзную працу з пазаштатнымі аўтарамі, праводзіла сходы, ладзіла вучобу.

Дарэчы, першая рабкараўская заметка на старонках нашай газеты з'явілася 30 снежня 1921 года.

З лютага 1922 года звесткі ў газету ўжо маглі паступаць не толькі днём, але і ноччу, па радыё, прамым тэлефоне.

У студзені 1923 года прайшла першая нарада рабочых карэспандэнтаў газеты «Звезда», дзе прысутнічала больш за 50 чалавек.

На адкрыцці нарады Вульф Нодэль (ён быў рэдактарам нашай газеты з 1922 па 1925 год) заўважыў: «Звезда» павінна быць газетай саміх рабочых. Мы, штатныя работнікі рэдакцыі, павінны працаваць з вамі. Мы ведаем некаторыя недахопы нашай газеты, але вы можаце указаць астатнія». Пра заўвагі рабкараў «Звезда» напісала ў нумары за 9 студзеня 1923-га: «Многа гаварылася аб вёрстцы, што яна не эканомная. Гаварылі, што «Звезда» — сухая, лаканічная, што ёсць перадрукоўкі з цэнтральных газет, што газета павінна больш месца адводзіць сялянскім пытанням. Гаварылі, што сувязь з чытачом слабая, што адсутнічае «Паштовая скрыня», што трэба палепшыць хроніку, друкаваць добрыя вершы (дзе іх узяць?), белетрыстыку, бібліяграфію і г.д.

Было прапанавана: арганізаваць экскурсіі ў друкарню для азнаямлення карэспандэнтаў з выпускам газеты; выкарыстоўваць менш замежных слоў, незразумелых для радавога чытача...». Між іншым, у гэты час газета ставіць перад сабой задачу: за паўгода «згуртаваць вакол газеты не менш пяці дзясяткаў новых газетных работнікаў», атрымліваць штодзень каля трох-чатырох дзясяткаў лістоў. І гэта пры тым, што карэспандэнт, на якога разлічвае газета, «толькі пачаў вучыцца грамаце і ўсё ж дае добры матэрыял аб жыцці завода».

Наогул у гэты час перад «Звездой» ставіцца задача займець не менш за аднаго карэспандэнта на кожным заводзе, фабрыцы, ва ўстанове.

У 1925 годзе загадчык аддзела «Рабочае жыццё» Праўдзін дасылае ў Аддзел друку ЦК КПБ справаздачу аб рабоце з рабкарамі, дзе расказвае, што на штотыднёвыя рабкараўскія сходы рэгулярна прыходзіць у сярэднім 45-50 чалавек. Па яго падліках, налічваецца каля 120 пастаянных рабкараў па Мінску, і каля 400 — па Беларусі.

У гэты час пры «Звезде» працуе гурток рабкараў. Самыя першыя заняткі, дзе чыталіся даклады «Аб паходжанні, формах і значэнні мовы», «Тэхніка газетнай і друкарскай справы», удзельнікаў гуртка не зацікавілі, колькасць наведнікаў падала. Затое калі на такіх пасяджэннях пачалі разбірацца публікацыі і асабліва тэксты, якія пайшлі «ў карзіну», праца гуртка ажывілася. «Указанні, як не трэба пісаць, значна хутчэй засвойваліся рабкарамі, чым дырэктывы, як трэба пісаць», — адзначаў Праўдзін.

У «Звезде» можна знайсці і заметкі рабкараў-замежнікаў, напрыклад, у 1927 годзе дасылаліся карэспандэнцыі з Ляйпцыга, Лондана, Персіі, Галандыі. Прычым замежныя аўтары ў краіну Саветаў дасылалі заметкі на мове эсперанта.

Трэба сказаць, што ў 1925 годзе сакратарыят ЦК КП(б)Б абавязаў кіраўнікоў прадпрыемстваў звяртаць асаблівую заўвагу на заметкі рабкараў і селькараў, якія тычацца дзейнасці іх установаў, і ў кароткі тэрмін даваць адказы ці тлумачэнні ў газеце па сутнасці такіх публікацый.

Пры дапамозе рабкараў у «Звезде» праводзяцца цэлыя кампаніі. Напрыклад, справаздачу аб такой рабоце газета дае ў нумары за 5 мая 1927 года. Тут яна распавядае аб праведзеных за апошні час кампаніях: «за рэжым эканоміі», «барацьба з бюракратызмам», «рацыяналізацыя дзяржапарата», «кампанія па зніжэнні цэн», «рацыяналізацыя вытворчасці».

Пра тое, які ўплыў мелі заметкі рабкараў, можна меркаваць і па публікацыі ў газеце за 5 мая 1930 года: «за 1929 год і чатыры месяцы 1930-га паводле заметак аддадзена пад суд 119 чал., знята з працы 163 чал., выключана з партыі 29 чал., адноўлена ў правах 14 чал., накладзена дысцыплінарных спагнанняў — 69 чал., знішчаны розныя паказаныя рабселькарамі недахопы ў 32 установах».

### Дзіцячая журналістыка

Са «Звездой» звязана і зараджэнне на Беларусі дзіцячай журналістыкі. У рэдакцыі назапашваўся матэрыял пра дзіцячыя дамы, школы, пра маладых грамадзян. Выходзіла рубрыка «Сярод дзяцей». Праз некаторы час сюды пачалі пісаць і самі дзеці. Неўзабаве пачала выходзіць і самастойная газета «Юный Строитель». У 1924 годзе, калі дзіцячае выданне адзначала год з моманту выхаду, «Звезда» пісала: «З кожным нумарам «Юный Строитель» усё больш вызваляецца з-пад апекі рэдакцыі «Звезды» — старых газетных работнікаў. Зараз нам амаль ужо не прыходзіцца кіраваць і накіроўваць «Юный Строитель». Ён мае даволі трывалую, сур'ёзную рэдакцыю і бюро юнкараў...»

### Пошук чытача

У сярэдзіне 20-х гадоў прымаліся розныя спробы павялічыць колькасць падпісчыкаў цэнтральных выданняў. Так, каб зацікавіць чытачоў падпісацца на больш доўгі тэрмін (на паўгода і на год), спрабавалі іх «прэміраваць» кнігамі. Рэклама друку ішла пісьмовая, вусная і мастацкая.

Пэўны час існавалі і льготы — пры калектыўнай падпісцы. Праўда, у ліпені 1925 года газета адмовіцца ад ільготнай калектыўнай падпіскі. Адна з прычын — на такіх падпісчыках «Звезда» мае страты, бо прадаецца ніжэй сабекошту.

### Пераход на беларускую мову

Напачатку планавалася, што на беларускую мову «Звезда» пяройдзе 1 студзеня 1927 года, але гэтая справа была адкладзена. Чаму? Адказ на гэтае пытанне можна знайсці ў рэзалюцыі з пленума ЦК КП(б)Б па пытанні аб пашырэнні межаў БССР: «У сувязі з далучэннем Гомельшчыны, дзе беларусізацыя павінна прайсці яшчэ першую стадыю, лічыць немэтазгодным пераход «Звезды» цалкам на беларускую мову з 1 студзеня 1927 года, паколькі гэты пераход аслабіў бы кіруючую сувязь Мінску ў дачыненні Гомельшчыны праз мацнейшую прыладу кіраўніцтва — газету ЦК КПБ».

Да пераходу «Звезды» на беларускую мову тыраж газеты складаў 20 тысяч экзэмпляраў. Ужо ў кастрычніку 1927 года (гэта толькі тры месяцы з пачатку выхаду на роднай мове) тыраж стаў усяго 6 тысяч. Толькі па Мінску колькасць падпісчыкаў упала на 80% (з 11600 экз. да 2400).

У даведцы кіраўніка Галоўнай канторы газеты «Звязда» Рубінштэйна аб пытаннях распаўсюджвання газеты ў сувязі з яе беларусізацыяй ад 24 кастрычніка 1927 года выказваюцца пэўныя прапановы аб тым, якім чынам можна было б узняць падпіску. «Заваёўваць падпісчыка «Звязда» павінна перш за ўсё сярод партыйнай масы, але поспех у гэтай справе цалкам залежыць ад той дапамогі, якую пры гэтым здольны аказаць партыйныя арганізацыі, пачынаючы ад ЦК і заканчваючы нізавой ячэйкай, якая дзейнічае па дырэктывах вышэйстаячых арганізацый».

Таксама прапануецца прасоўваць продаж «Звязды» праз кааператыўныя крамы, дзе спажывец зможа «знайсці не толькі паркаль, махорку і газу, але і газету».

У плане — выйсці на краязнаўцаў, у той час на Беларусі іх налічваецца 9 тысяч. Яны павінны «шчыльна звязацца з газетай, актыўна прымаць удзел у газеце сваімі карэспандэнцыямі з месцаў. Краязнаўцы — карэспандэнты і чытачы «Звязды» — вось лозунг, які павінен здзейсніць і правесці ў жыццё прэзідыум Інбелкульта праз Цэнтральнае бюро краязнаўства і раённыя таварыствы краязнаўства»...

Ужо ў сярэдзіне 1928 года тыраж газеты паступова пачынае расці, у 1929 годзе ён складае ўжо больш за 20 тысяч экзэмпляраў.

**Алена ДЗЯДЗЮЛЯ, Вячаслаў СЕЛЯМЕНЕЎ, кандыдат гістарычных навук.**

## «Чым большы памер страхавой сумы, указанай у дагаворы страхавання, тым большыя страхавыя ўнёскі»

«ГАРАЧЫ» 287 17 41

**З пытаннем пра страхаванне жывёлы ў рэдакцыю звярнулася жыхарка вёскі Сітцы Докшыцкага раёна, наша даўняя чытачка Галіна Рыгораўна Ваховіч. Дакладней, яе запыт быў наконт сум страхавых узносаў.**

— Мы ўжо 40 гадоў трымаем карову. І ўвесь гэты час страхуем жывёлу. Ды і не толькі яе: і па абавязковым, і па добраахвотным страхаванні даўно ўжо страхуем і маёмасць, і саміх сябе. Таму маем добрую зніжку пры страхаванні — 60 працэнтаў. Нядаўна трэба было ўносіць чарговую страхавую суму на наступны год. Калі пабачылі суму, вельмі здзівіліся — 772 тысячы рублёў. Гэта пры зніжцы?!. Летась трэба было ўнесці 200 тысяч рублёў. Адкуль такая розніца, ніхто нам патлумачыць не змог. Так, нашай карове — больш за 10 гадоў, таму сума страхавога ўзносу большая, чым калі б рагуля была маладзейшай. Калі б карове было гадоў 5-6, уносіць трэба было б тысяч 400. Але ж памяняць рагулю не так проста, найперш па фінансавых прычынах. А без малака — як? Асабліва пенсіянерам зараз? Калі мы, ды і іншыя, перастануць трымаць жывёлу, каму ад гэтага стане лягчэй? — даводзіла нам сутнасць справы заяўніца. — Каб дагавор страхавання не страціў сілу, грошы мы ўсё ж унеслі. Але пытанні засталіся...

З просьбай дапамагчы даць кампетэнтны адказ на пытанне аб памеры страхавых унёскаў па добраахвотным страхаванні жывёл, якія належаць грамадзянам, рэдакцыя «Звязды» звярнулася ў Беларускае рэспубліканскае ўнітарнае страхавое прадпрыемства «Белдзяржстрах». Неўзабаве мы атрымалі адтуль афіцыйнае рэагаванне.

«Белдзяржстрах» заключае дагаворы страхавання буйной рагатай жывёлы і коней на ўмовах Правілаў № 34 добраахвотнага страхавання жывёл, якія належаць грамадзянам, узгодненых Міністэрствам фінансаў Рэспублікі Беларусь 03.03.2004 за № 123, у новай рэдакцыі, узгодненай 05.01.2011, са змяненнямі і дапаўненнямі ад 26.04.2011 № 76 і 03.11.2011 № 172.

Памер страхавых унёскаў разлічваецца па вызначаных у працэнтах ад страхавой сумы базавых страхавых тарыфах (гадавых) па кожным відзе і ўзроставай групе жывёл у залежнасці ад варыянта страхавання, з выкарыстаннем адпаведных карэкцыйных каэфіцыентаў, у тым ліку ў залежнасці ад фактараў, якія ўплываюць на ступень рызыкі.

Страхавая сума — вызначаная дагаворам страхавання грашовая сума, у межах якой страхоўшчык абавязаны правесці страхавую выплату пры надыходзе страхавога выпадку. Паводле дагавора страхавання, заключанага з І.М. Ваховічам у красавіку 2011 года, страхавая сума вызначана ў памеры 2,1 мільёна рублёў.

У сувязі з павелічэннем сапраўднага кошту жывёлы на дзень аднаўлення дагавора страхавання з І.М. Ваховічам (10 красавіка 2012 года), для забеспячэння дзейснай страхавой абароны была прапанавана страхавая сума ў памеры 8,5 мільёна рублёў.

Такім чынам, чым большы памер страхавой сумы, указанай у дагаворы страхавання, тым большыя страхавыя ўнёскі. Пры вывучэнні дагавора страхавання, заключанага з І.М. Ваховічам, парушэнняў не выяўлена».

**Сяргей РАСОЛЬКА.**

## КІРОЎЦА Ў БАЛЬНІЦЫ, ЛАСІХА ЗАГІНУЛА

На дарозе Сапоцкін — Усава ля вёскі Новікі Гродзенскага раёна «Аўдзі» збіла ласіху, якая раптам выйшла на паласу руху машыны. Кіроўцу давялося шпіталізаваць. Жывёла загінула на месцы.

**Алег ДУК, старшы інспектар ДАІ УУС Гродзенскага аблвыканкама.**


CREDEX BANK

**Настоящим уведомляем вкладчиков ЗАО «Кредэксбанк» ОБ ИЗМЕНЕНИИ ПРОЦЕНТНЫХ СТАВОК по депозиту в белорусских рублях «Зебра»:**

| Наименование банковского депозита | Срочный банковский депозит в белорусских рублях «Зебра» | | | |
|---|---|---|---|---|
| Сумма вклада, руб. (фактический ежедневный остаток) | Процентная ставка (годовых), в зависимости от периода нахождения денежных средств во вкладе | | | |
| | с 1 по 3 месяц | с 4 по 6 месяц | с 7 по 9 месяц | с 10 по 12 месяц |
| **От 500 000 до 10 000 000 (включительно)** | **30 %** | **31%** | **32%** | **33%** |
| **От 10 000 001 до 25 000 000 (включительно)** | **30,5%** | **31,5%** | **33,5%** | **35%** |
| **От 25 000 001 до 50 000 000 (включительно)** | **31%** | **32%** | **34,5%** | **36%** |
| **Более 50 000 001** | **31,5%** | **33%** | **35,5%** | **37%** |

Указанные процентные ставки вводятся в действие с 05.06.2012 года по договорам срочного банковского депозита в белорусских рублях «Зебра», заключенным до 04.05.2012 года.

*Лицензия на осуществление банковской деятельности от 9 ноября 2011 года № 19.*

# ПРАЙСЦІ ПА ХРУЦКІМ

**Каб трапіць у музей — аднаго жадання мала. Патрэбен квіток, які адкрые вам доступ да чароўнага свету мастацтва. Хутка ў Нацыянальны мастацкі музей Беларусі будуць пускаць па квітках з абноўленым дызайнам — франтальную частку ўпрыгожыць фрагмент карціны Івана Хруцкага.**




**Квіток-пераможца конкурсу «Дызайн уваходнага квітка-2012 у Нацыянальны мастацкі музей Рэспублікі Беларусь». Аўтар — Маргарыта Канавалава.**

Днямі Нацыянальны мастацкі музей падвёў вынікі публічнага конкурсу «Дызайн уваходнага квітка-2012», які сёлета адбыўся 8-ы раз. Свой дызайн для ўваходнага квітка прапанавалі 48 чалавек з усёй Беларусі. Усяго на суд журы, у склад якога ўвайшлі, напрыклад, дырэктар музея Уладзімір Пракапцоў, старшыня Беларускага саюза дызайнераў Дзмітрый Сурскі, кандыдат мастацтвазнаўства Ірына Скварцова, было прадстаўлена 70 работ. Галоўны прыз (3,5 млн руб. ад генеральнага партнёра музея, замежнага прыватнага прадпрыемства «Брыціш-Амерыкан Табака Трэйдзінг Кампані») і права рэалізацыі свайго эскіза атрымала графічны дызайнер з Мінска Маргарыта Канавалава. Менавіта ў яе эскізе, на думку журы, спалучыўся модны сёння мінімалізм і павага да традыцый беларускага класічнага жывапісу. На франтальную частку квітка Маргарыта змясціла фрагмент нацюрморта Івана Хруцкага. Цікава, што віцебская мастацкая школа гучна заявіла пра сябе на сёлетнім конкурсе. Уладальніцы двух астатніх прызоў — віцябчанкі. Дызайнер Вольга Шыманка атрымала прыз глядацкіх сімпатый і 1,3 млн руб. за мадэрновы варыянт квітка, у якім спалучыліся беларуская і англійская мовы і стылёва скампанаваныя фрагменты славутых мастацкіх твораў, якія захоўваюцца ў нашым музеі. Яшчэ адна таленавітая віцябчанка Ганна Мельнічук — студэнтка Віцебскага дзяржаўнага тэхналагічнага ўніверсітэта, вядомага моцнай кафедрай дызайну. Ганна атрымала спецыяльны прыз дырэктара музея за працу, у якой абыграла фармат і арнамент беларускіх слуцкіх паясоў. Яе квіток атрымаўся падобным да фрагмента-абрэзка слуцкага пояса. Ідэя вельмі высакародная і патрыятычная, нават калі ўлічваць, што ў Нацыянальным мастацкім музеі слуцкіх паясоў, на жаль, няма... А можа — пакуль няма?..

— Музей — гэта не застылы арганізм, а дастаткова сучасная структура, — лічыць Ірына Скварцова, загадчыца аддзела навукова-асветніцкай дзейнасці Нацыянальнага мастацкага музея Рэспублікі Беларусь. — Таму і квіток у музей мусіць быць крэатыўным і сучасным. Было важна выбраць такі варыянт, які спалучаў бы ў сабе мадэрновасць і прагрэсіўнасць дызайну з павагай да традыцыі.

Наогул, большасць конкурсных работ не адрознівалася высокім прафесіяналізмам. Выдатная ідэя — у якасці фону ўзяць партрэт Марка Шагала, напрыклад, і «замасціць» ім усю паверхню квітка. Але шрыфт на такім фоне чытаецца вельмі дрэнна. Наведнік наўрад ці зможа лёгка прачытаць тое, што на ім будзе напісана. Аўтар яўна гэтага не ўлічыў. Былі квіткі з рэпрадукцыямі Врубеля, бюстамі Коласа, беларускімі абразамі і арнаментамі, былі стылізацыі пад прымітывізм і кубізм. Былі алюзіі на Малевіча і квіткі ў стылі «дзіцячая мастацкая школа «Вясёлка»... Часта ідэі аказваліся куды больш вартымі, чым увасабленне. Але адметна тое, што бадай усе аўтары добра зразумелі кантэкст: важнасць выявы на ўваходным квітку ў галоўны музей краіны. Патрыятычныя пачуцці не пакінулі нас! Відавочна: выява на ўваходным квітку ў музей мусіць мець адбітак беларускасці, а не быць безаблічна англамоўнай і глабалізаванай.

**Вольга ЧАЙКОЎСКАЯ.**

■ 100 славутых прозвішчаў Беларусі

# ГЕДЗІМІНЫ



Прозвішча Гедзімін (Гедымін) у беларусаў у першую чаргу асацыюецца з імем вялікага князя Вялікага Княства Літоўскага, які жыў прыкладна з 1275 па 1341 год, княжыў з 1316 па 1341 год. Гэты князь увайшоў у гісторыю як збіральнік беларускіх земляў. Менавіта ў гэты перыяд, паводле слоў вядомага гісторыка Міколы Ермаловіча, фактычна завяршыўся працэс мірнага аб'яднання асноўнага масіву беларускіх земляў ад Заходняга Буга да Дняпра: да дзяржавы быў далучаны горад Віцебск з княствам, Мінская і турава-пінскія землі, рэшткі берасцейскай зямлі. У выніку ВКЛ павялічылася амаль у два разы і стала магутнай усходнееўрапейскай дзяржавай. Гедзімін у 1323 годзе перанёс сталіцу з Навагрудка ў крывіцкае пасяленне — Крывы горад на Віліі — Вільню. У гэты перыяд Вільня стала палітычным, культурным, эканамічным і рэлігійным цэнтрам беларускіх земляў і захоўвала гэты статус на працягу некалькіх стагоддзяў — да пачатку XX стагоддзя. Гедзімін клапаціўся пра палітычнае, ваеннае і эканамічнае ўмацаванне дзяржавы. Пры Гедзіміне ВКЛ вяло барацьбу з




Пашырэнне прозвішча Гедзімін (Гедымін) у Беларусі

Тэўтонскім ордэнам і Маскоўскім вялікім княствам з мэтай пашырэння тэрыторыі дзяржавы. Па ініцыятыве Гедзіміна былі пабудаваны замкі ў Вільні (знакамітая вежа Гедзіміна), Крэве, Троках, Медніках, Лідзе і іншыя. Князь запрашаў у гарады ВКЛ адукаваных людзей з Еўропы, рамеснікаў і купцоў. У адносінах да царквы прытрымліваўся нейтралітэту: дазваляў будаўніцтва як праваслаўных, так і каталіцкіх храмаў. Гісторыкі лічаць, што менавіта пры Гедзіміне ВКЛ сфарміравалася як феадальная манархія, у якой князь валодаў паўнатой заканадаўчай, выканаўчай, судовай і ваеннай улады. Дзякуючы таму, што цэнтр дзяржавы склалі беларускія землі, у перыяд княжання Гедзіміна сфарміраваліся ўсе перадумовы, каб старабеларуская мова стала дзяржаўнай, а асновай прававых нормаў — нормы старабеларускага права. Гедзімін стаў родапачынальнікам дынастыі Гедзімінавічаў, з якой пайшлі знакамітыя беларускія, украінскія, літоўскія і рускія княжацкія роды (Альгердавічы, Кейстутавічы, Алелькавічы, Бельскія, Вішнявецкія, Галіцыны, Карыбутавічы, Кобрынскія, Мсціслаўскія, Нарымонтавічы, Трубяцкія, Хаванскія, Чартарыйскія і іншыя), палітычныя дзеячы Венгрыі і Чэхіі, а таксама каралеўская дынастыя Ягелонаў у Польшчы.

**Паходжанне роду і прозвішча.** Адзінага погляду на паходжанне роду Гедзіміна не існуе. Адны даследчыкі лічаць яго сынам Віценя, другія — яго братам. Некаторыя сучасныя вучоныя мяркуюць, што Гедзімін быў сынам ці зяцем яцвяга Скалманта (Скаламента). На думку іншых, бацька яго — літоўскі князь Лютувер.

Прозвішча **Гедзімін** на тэрыторыі сучаснай Беларусі мае варыянт **Гедымін**. У старажытнасці імя Гедзімін мела значна большую колькасць варыянтаў: **Гедиминъ, Гедименъ, Гедиманъ, Едеминъ, Кедмин, Скиндимин, Гердимин, Gediminne, Ghodeminne, Godeminnus.**

У навуковым асяроддзі не існуе адзінай версіі адносна паходжання імя Гедзімін. Большасць даследчыкаў гэта імя разглядае як складанае. Першая частка **(gede-, god-, gode-),** на думку гісторыка літаратуры А. Бразгунова, узыходзіць да германскіх **god, gud (бог)** і ўжывалася ў значэнні **добры, выдатны**. Даследчык дапускае таксама, што аснова **gode** магла з'яўляцца стараскандынаўскім тэрмінам, які абазначаў найвышэйшых язычніцкіх жрацоў і старэйшын. А. Бразгуноў дапускае, што другая частка імя можа ўзыходзіць да германскага **magin, megin (сіла, удар, энергія)**. У такім выпадку імя Гедзіміна магло абазначаць **добры ўладар**. Вучоны не выключае таксама магчымасць паходжання другой асновы імені ад старажытнаверхненямецкага слова **minne (любоў, каханне)**. У такім выпадку імя **Гедзімін** магло абазначаць **Дабралюб**. Існуе таксама версія, паводле якой імя Гедзімін паходзіць з літоўскай мовы, дзе **gedeti — сумаваць,** а **mintis — думка**.

На тэрыторыі сучаснай Беларусі прозвішча **Гедзімін (Гедымін)** сустракаецца ў горадзе Мінску, у Барысаўскім і Бярэзінскім раёнах Мінскай вобласці і Асіповіцкім і Бабруйскім раёнах Магілёўскай вобласці. Значна шырэй распаўсюджана гэтае прозвішча на тэрыторыі Літвы. Людзей з прозвішчам **Гедзімін** можна сустрэць у Польшчы, Даніі і ЗША. Неаднаразова гэтае прозвішча адзначаецца ў Сібіры і на Далёкім Усходзе, куды ў свой час выехалі або былі высланы многія з беларусаў.

**Ігар КАПЫЛОЎ, кандыдат філалагічных навук, вучоны сакратар Інстытута мовы і літаратуры імя Якуба Коласа і Янкі Купалы НАН Беларусі.**

# ЧЭШСКАЯ ВЯСНА ДЛЯ БЕЛАРУСКІХ ТВОРЦАЎ

## Драматургія Карла Чапека дапамагла тэатру-студыі кінаакцёра здзейсніць культурны прарыў

**Прынамсі, менавіта так акцёры і супрацоўнікі беларускага тэатра-студыі кінаакцёра вызначылі сутнасць свайго гастрольнага выступлення на сцэне Пражскага тэатра «Эпсілан». Хоць іх саміх і непакоіла тое, што спектакль «Сродкі Макропалуса» перш за ўсё трымаецца на тэксце, які беларускія артысты прамаўляюць не па-чэшску, але менавіта наш тэатр настойваў на тым, што калі ўжо ехаць у Прагу — то са спектаклем паводле чэшскай драматургіі.**

— Калі мы збіраліся ставіць гэтую п'есу, то не задумваліся пра дату, проста так супала. І не дзіўна, што нам здалося лагічным ісці да чэшскага гледача з чэшскай драматургіяй. Тым больш што гэты спектакль — наша апошняя прэм'ера, — тлумачыць **рэжысёр Таццяна ТРАЯНОВІЧ**. — Мы запрашалі пасла Чэхіі ў Беларусі Іржы Караса паглядзець наш спектакль, нам была цікавая яго думка наконт нашага прачытання Чапека. Было асабліва прыемна, што і ў Празе ён прыйшоў паглядзець спектакль яшчэ раз, быў вельмі задаволены, што наш беларуска-чэшскі культурны праект ажыццявіўся.

Гастрольная паездка беларускага тэатра ў Прагу адбылася пры дапамозе пасольства Беларусі ў Чэшскай Рэспубліцы з фінансавай падтрымкай Міністэрства культуры РБ. У зале пражскага тэатра «Эпсілан» на паказе спектакля беларускага тэатра, акрамя чэшскіх гледачоў, прысутнічалі прадстаўнікі міністэрстваў замежных спраў Украіны, Казахстана, Малдовы, Расіі.

— Гэта прарыў і для нашай краіны, для нашай культурнай прасторы, — упэўнена **актрыса Вера ПАЛЯКОВА**, якая выканала ў спектаклі галоўную ролю — Эміліі Марці. — Гастрольныя паездкі — гэта магчымасць культурных зносін паміж людзьмі. Трэба сябраваць народамі. Мастацтва павінна быць па-за палітыкай. Гэтая п'еса — пра вечнае: пра жыццё і смерць, пра каханне, пра тое, што хвалюе любога чалавека. Перад выхадам на сцэну Таццяна Траяновіч сабрала ўсіх артыстаў і сказала: «Калі раптам не засмяяліся, не запляскалі, на нешта не зрэагавалі, то не бянтэжцеся, іграйце, як вы адчуваеце, як вы гэта робіце ў нас у тэатры». Мы выходзілі на сцэну, гатовыя да таго, што ў зале будзе мёртвая цішыня з-за таго, што нас могуць не зразумець. Але зала дыхала разам з намі. І гумар усе зразумелі, і драматычныя моманты. Напэўна, людзі, дзе б яны ні жылі, на якой бы мове ні размаўлялі, падобныя адзін да аднаго сваімі эмоцыямі, перажываннямі. Я як актрыса адчувала, што вяду за сабой залу, што глядач мяне чуе і адчувае тыя эмоцыі, якія я іграю на сцэне. Мне здаецца, так мы не ігралі ніколі, як ігралі там...

Тэатр лічыць гэты паказ сваёй перамогай: публіка ў зале сабралася дасведчаная, але на паклоне ўсе ўзняліся.

Гэтае выступленне дало магчымасць зразумець, што межы гастрольных паездак тэатра могуць пашырацца. У Чэшскай Рэспубліцы будзе магчымасць у наступным сезоне паказаць спектакль «№13» паводле Рэя Куні. У перспектыве — удзел у Днях культуры Беларусі ў Літве з двума спектаклямі.

Беларускую публіку тэатр збіраецца парадаваць напрыканцы сезона прэм'ерай спектакля паводле Кандрата Крапівы «Хто смяецца апошні?». Усяго ў рэпертуары аднаго з самых папулярных у гледача беларускіх тэатраў 25 спектакляў.

**Ларыса ЦІМОШЫК.**

Сардэчна віншуем **Марыю і Іосіфа ВЯЛІЧКАЎ** з залатым вяселлем, якое яны адзначаюць 6 мая.
Жадаем Вам здаровымі і вясёлымі яшчэ доўга-доўга ісці побач па жыцці!

*Жадаем шчасця і ўсмешак,*
*Жыццё каб было цэльным вершам.*
*Паўнютка красак, зёлак,*
*Найпрыгажэйшых тых вясёлак,*
*Што нашу Зямлю ўпрыгажаюць,*
*Калі дажджы ўвесь бруд змываюць.*
*Каб ліхалецце ўсё і гора*
*Згубіліся за дальнім морам*
*І больш каб побач не ўзнікалі,*
*Вас каб ніколі не хвалявалі!*



**З любоўю дачка Людміла, зяць Валерый, унукі Вольга, Алёна, Аляксандр.**

# НЕЗВЫЧАЙНЫЯ ЗАЎЗЯТАРЫ БАТЭ І СЫХОД ГУРЭНКІ

**Цікавае пераўвасабленне адбылося з фанамі чэмпіёнаў у Жодзіне, дзе мясцовае «Тарпеда» ў 8-м туры футбольнага першынства прымала каманду Віктара Ганчарэнкі. Замест звычайных футболак і джынсаў яны апранулі строгія кашулі і штаны.**

Як стала вядома, пайсці на падобны крок іх вымусіла дата. У дзень гульні яны святкавалі 15-годдзе арганізаванага барысаўскага фан-руху. А ўсё пачалося яшчэ ў далёкім 1997-м, калі балельшчыкі «жоўта-сініх» упершыню масава наведалі Пінск. Гэтым разам фаны таксама не сціхалі, увесь матч гучна падтрымлівалі каманду песнямі і нават пераклічкай. Барысаўчан на жодзінскай арэне сапраўды было шмат. Дапамагло. Госці перамаглі з лікам 2:0 дзякуючы трапным ударам Рэнана Брэсана і Дзмітрыя Мазалеўскага. Госці маглі і яшчэ забіць, але выдатна ў рамцы выглядаў варатар «Тарпеда» Павел Часноўскі.



— Па якасці гэта была лепшая гульня ў нашым выкананні ў гэтым сезоне. У тым ліку дзякуючы жодзінскаму газону, — прызнаўся падчас размовы з прэсай Віктар Ганчарэнка. — Лічу, што на працягу матча мы мелі добрую перавагу і заслужана перамаглі. Трэба аддаць належнае нашым фанатам, якія добра падтрымліваюць нас і дома, і на выездзе.

Для візаві Ганчарэнкі, Сяргея Гурэнкі, чорная паласа працягваецца. Пасля паражэння ад БАТЭ «чорна-белыя» апынуліся на апошнім радку табліцы.

— Заўжды казаў, што ёсць шмат добрых футбалістаў, але перамагаюць адзінкі: тыя, хто мае характар, хто можа прадэманстраваць, хто на полі гаспадар. Такіх у мяне няма. І за дзень выхаваць, падрыхтаваць немагчыма, — шчыра прызнаўся пасля гульні Гурэнка. Учора ён скасаваў кантракт і пакінуў «Тарпеда».

Некалькі слоў пра астатнія матчы тура: «Славія» — «Мінск» — 1:0, «Шахцёр» — «Нёман» — 1:1, «Нафтан» — «Брэст» — 1:0, «Гомель» — «Белшына» — 1:0. Першы радок займае БАТЭ, на бал ад барысаўчан адстае «Гомель», на трэцяй пазіцыі — «Шахцёр».

**Тарас ШЧЫРЫ,** *Жодзіна.*

# ІНІЦЫЯВАЦЬ БЯСПЛАТНЫ ПРАЕЗД ДЛЯ ЎСІХ СТУДЭНТАЎ У МІНАДУКАЦЫІ НЕ ПЛАНУЮЦЬ

**«Ці могуць спадзявацца студэнты дзённай формы навучання на бясплатны праезд у грамадскім транспарце ў наступным навучальным годзе?» — такое пытанне прагучала на сустрэчы студэнцкага актыву Беларускага дзяржаўнага педагагічнага ўніверсітэта з міністрам адукацыі Сяргеем Маскевічам.**

— Рашэнне даць студэнтам сталічных ВНУ магчымасць бясплатна карыстацца гарадскім пасажырскім транспартам належыць выключна сталічнай мэрыі, і Міністэрства адукацыі вельмі станоўча ацэньвае гэты крок насустрач моладзі з боку кіраўніцтва Мінгарвыканкама. Аднак узнімаць пытанне аб прадастаўленні права бясплатнага праезду для ўсіх студэнтаў краіны мы не плануем. Больш за тое, я абсалютна ўпэўнены, што сёння ёсць дастаткова магчымасцяў, каб маладыя людзі маглі падзарабіць і не браць на гэтыя мэты грошы ў сваіх бацькоў, — падкрэсліў Сяргей Маскевіч. — Або студэнты возьмуць грошы ў сваіх бацькоў, або дзяржава возьме грошы на ўтрыманне гарадскога пасажырскага транспарту з усіх нас, але маладыя людзі павінны зразумець, што хтосьці гэтыя грошы павінен будзе зарабіць. Нічога бясплатнага не бывае. У Мінску знайшліся фінансавыя магчымасці, каб падтрымаць студэнтаў такім чынам. Я расцэньваю гэта як знак удзячнасці студэнцкай моладзі за яе ўклад у развіццё сталіцы, за вашу актыўнасць. Але не ва ўсіх рэгіёнах ёсць такія магчымасці...

**Надзея НІКАЛАЕВА.**

■ Медыяпрастора

## «МАЛАДОСЦЬ»




**Пабачыў свет новы, красавіцкі нумар часопіса «Маладосць». У ім, як заўсёды, азнаны чытач знойдзе разнастайныя цікавыя матэрыялы: аповесці, апавяданні, вершы, а таксама публіцыстычныя, краязнаўчыя, крытычныя і літаратуразнаўчыя артыкулы.**

Напрыклад, не пакіне абыякавым аповесць Андрэя Федарэнкі «Дзікі Луг» — кранальны расповед пра вясковае жыццё з яго побытам, радаснымі і сумнымі падзеямі, пакручастымі лёсамі. Таксама зацікавіць аповесць Міхася Южыка «Хто там, за дзвярыма?». Яна ўжо пра жыццё ў горадзе, але зноў-такі з інтрыгуючымі лёсамі асобных людзей.

На паэтычных старонках розныя па стылі вершы аўтараў розных пакаленняў — Эдуарда Зубрыцкага, Соф'і Шах, Марыны Варабей.

Публіцыстычная частка часопіса прадстаўлена разнастайнымі актуальнымі і пазнавальнымі матэрыяламі як традыцыйных, так і новых рубрык. Так, запачаткавана рубрыка «Дыялог», як вынікае з назвы, — раўнапраўная гутарка двух чалавек, і госць «Маладосці» — рэдактар, практыкуючы псіхолаг і нават астрапсіхолаг Аляксей Селянінаў.

Свята Камаедзіца прысвечана мядзведзю, а яго лейтматыў — абуджэнне прыроды, нараджэнне лета. Да таго ж нашы прадзеды лічылі гэтую жывёлу сваім першапродкам, духам-ахоўнікам, увасабленнем душы. Пра гэта і іншыя цікавыя факты чытайце ў матэрыяле Ірыны Клімковіч «Мядзведзюхна, мой бацюхна...» пад рубрыкай «Этнасфера».

## «ПЛАНЕТА»




**Галоўная тэма красавіцкага нумара «Планеты» — эканамічныя наступствы здабычы і продажу сланцавага газу. Акрамя таго чытачы даведаюцца пра палітычную сітуацыю ў Малі, якая склалася ў выніку паўстання качэўнікаў-туарэгаў, а таксама атрымаюць магчымасць паразважаць пра тое, якія псіхалагічныя праблемы ў хуткім часе могуць ператварыцца ў сапраўдную эпідэмію.**

Тых, хто неабыякавы да навукова-тэхнічнага прагрэсу і асваення космасу, зацікавяць артыкулы, прысвечаныя «луннай гонцы» і шматлікім праектам «нябеснага аўтамабіля». А для аматараў сучаснай тэхнікі і спорту часопіс прапануе кароткі агляд гісторыі ралі «Дакар» і інтэрв'ю з яго ўдзельнікамі.

Чытачы, якіх вабяць экзатычныя куткі планеты, пазнаёмяцца з востравам Мантсерат, а аматары гісторыі змогуць прачытаць пра старажытны Смедзін і пра тое, адкуль узяліся бабуліны забабоны. Таксама яны ўбачаць, якое злачынства натхніла Эдгара По на стварэнне чарговага шэдэўра, і пазнаёмяцца з асобай стваральніка эсперанта.

Напрыканцы нумара тыя, каго цікавіць навука і ўласнае здароўе, змогуць даведацца пра тое, што такое сон, як і колькі трэба спаць і ці трэба верыць снам.

## «БЕЛАРУСКАЯ ДУМКА»




**Асноўнай тэмай красавіцкага нумара часопіса «Беларуская думка» стала тэма беларуска-турэцкага супрацоўніцтва. 20 гадоў таму паміж нашымі краінамі былі ўсталяваны дыпламатычныя адносіны, і журналісты выдання разам з беларускімі і турэцкімі палітолагамі прадставілі шырокі спектр меркаванняў пра ўзаемавыгаднае супрацоўніцтва Беларусі і Турцыі і перспектывы яго пашырэння. Надзвычайны і Паўнамоцны Пасол Турэцкай Рэспублікі ў Рэспубліцы Беларусь Джват Незіхі Азкай распавёў у інтэрв'ю пра асноўныя моманты міждзяржаўных сувязяў, інвестыцыйнай палітыкі яго краіны ў адносінах да Беларусі і іншыя кірункі турэцка-беларускага партнёрства.**

Член-карэспандэнт НАН Беларусі, прафесар Алег Давыдзенка распавядае аб даследаванні паходжання беларусаў з дапамогай генетыкі, пра тое, навошта збіраўся генетычны банк карэнных беларусаў, якія таямніцы ўтойвае ў сабе ДНК і як з разнастайнасці спадчынных кодаў атрымалася практычна ўзнавіць генетычны партрэт беларусаў. Гісторык Міхаіл Смальянінаў у артыкуле «У акопах пад Смаргонню» распавядае пра адну з найбольш трагічных старонак Першай сусветнай вайны на тэрыторыі сучаснай Беларусі — аб газавых атаках, здзейсненых у 1916 годзе германскімі войскамі супраць расійскіх воінскіх падраздзяленняў каля Смаргоні, у наваколлях возера Нарач і на іншых участках Заходняга фронту. А журналіст Сяргей Галоўка ў артыкуле «Каманда, якая заўсёды выйграе» прадстаўляе стратэгію развіцця і дзейнасці сумеснага беларуска-нямецкага прадпрыемства «Хенкель Баўтэхнік» — лідара айчыннай будаўнічай індустрыі.

**Сяргей ЖОЛУД**

# ДВА ПРЭТЭНДЭНТЫ. А КАРОНА АДНА

## 10 мая ў Маскве пачынаецца матч за званне абсалютнага чэмпіёна свету па шахматах

**Масква, музей, інжынерны корпус Траццякоўскай галерэі. Менавіта там пачынаецца дуэль паміж уладальнікам шахматнай кароны Вішы Анандам (Індыя) і прэтэндэнтам на каралеўскі тытул, выхаванцам беларускай шахматнай школы Барысам Гельфандам. Ураджэнец радзімы шахмат Індыі Вішванатан Ананд апошнім часам месцам жыхарства абраў Іспанію. Барыс Гельфанд нарадзіўся ў Мінску, але з 1998 года жыве з сям'ёй у Ізраілі. Вішы і Барыс амаль аднагодкі: экс-мінчаніну 44 гады, а экс-індыец на некалькі месяцаў маладзейшы.**

**Шахматны серыял будзе складацца з 12 паядынкаў з класічным кантролем часу, а пры нічыйным выніку 6:6 рэгламент матча прадугледжвае «тай-брэйк» (чатыры дадатковыя партыі ў хуткія шахматы). Няма ніякіх таямніц і наконт прызавога фонду — ён складае два з паловай мільёны долараў. Дзяльба гэтай сумы такая: 60% чэмпіёну (плюс карона) і 40% — віцэ-чэмпіёну.**

**Пакуль шахматныя гадзіннікі яшчэ не запушчаны і гульня не пачалася, пагартаем старонкі шахматнага дасье. Апошнім часам Барыс Гельфанд даволі неахвотна рассакрэчвае таямніцы сваёй творчай лабараторыі. Гэта зразумела. І тым не менш...**

У свой час з Барысам мяне звёў журналісцкі лёс. Прыгадваю мінскі жнівень 1979 года. У адным з мікрараёнаў беларускай сталіцы спартыўны клуб «Саюз-9» ладзіў фізкультурна-аздараўленчае свята пад назвай «Тата, мама і я — спартыўная сям'я». Спаборнічалі аматары розных відаў спорту — валейбалісты, тэнісісты, футбалісты, шашысты, аднак масоўку гульцоў і балельшчыкаў сабраў шахматны бліц-турнір. Знаўцы старажытнай гульні розных узростаў — ад піянераў да пенсіянераў — згрупаваліся каля століка, за якім сядзеў чарнявы хлопчык. Паводзіны яго сапраўды не маглі не зацікавіць: драўляныя фігуры на дошцы ў чорна-белую клетачку ён перасоўваў імпульсіўна, амаль не задумваючыся, а сам у гэтыя імгненні жангліраваў заваяванымі пешкамі, сланамі і канямі, прыўзнімаўся з крэсла, бо яшчэ ледзьледзь дацягваўся, каб націснуць кнопку шахматнага гадзінніка...

Я таксама наблізіўся да эпіцэнтра падзей і адразу ўспомніў, дзе бачыў таго хлопчыка. Дык гэта ж «стары знаёмы Барыс», з якім мы сустракаліся год таму ў шахматным клубе па вуліцы Змітрака Бядулі на шахматным мемарыяле Аляксея Сакольскага... Тады вучань трэцяга класа Барыс разам з бацькам прыходзіў браць не толькі ўрокі шахматнага майстэрства, а насамрэч падтрымаць васьмікласніка адной са школ горада Баку — будучага пераможцу мінскага турніру, а неўзабаве і будучую зорку сусветных шахмат Гарыка Каспарава... І вось яшчэ адна сустрэча з Барысам, а ён выступаў ужо не ў якасці балельшчыка, а гульца, які «матаваў» аднаго саперніка за другім...

Разгаварыліся. Менавіта тады я і занатаваў міні-маналог вучня 4-га класа Барыса Гельфанда для часопіса «Беларусь»: *«У нашым двары заўсёды весела і некалі сумаваць. Фізкультура гартуе волю, уздымае настрой. У мяне першы разрад па шахматах, сам я з ахвотаю, акрамя шахмат, ганяю футбольны мяч...»*

Мінула дзве вясны, і ў Маскву, на шахматную сесію знакамітай школы экс-чэмпіёна свету Тыграна Петрасяна прыехаў з Мінска ўжо знаёмы нам хлопчык, вучань 6-га класа Барыс Гельфанд. Манера, стыль гульні юнага мінчаніна (дарэчы, ужо кандыдата ў майстры) прыйшліся даспадобы Тыграну Вартанавічу, і ён адзначыў: «Для Барыса шахматы пакуль што забава... Ці вырасце з яго гросмайстар? Пажывём — пабачым...»

Пажылі... І што пабачылі? Пабачылі шмат цікавага...

Зіма 1983 года. На мемарыяле заслужанага трэнера СССР Аляксея Сакольскага вучань восьмага класа Барыс Гельфанд паднёс сюрпрыз: ён апярэдзіў 2 гросмайстраў і 11 майстроў, заняў першае месца і сам выканаў нарматыў майстра спорту СССР! Адбылося «паўтарэнне пройдзенага»? Мелася на ўвазе перамога на падобным мемарыяле ў тым жа шахматным клубе па вуліцы Змітрака Бядулі васьмікласніка з Баку Гарыка Каспарава. Сёй-той гэтае супадзенне ўспрыняў як «маленькую сенсацыю мясцовага значэння». А насамрэч тады адбылася падзея знакавая, бо таленавіты дэбютант Барыс Гельфанд пайшоў шляхам Каспарава. Праўда, крочыў ён да шахматнага алімпу не такімі хуткаснымі тэмпамі, як некалі «рэактыўны Гарык»...

Званне міжнароднага гросмайстра Барыс атрымаў у 20-гадовым узросце. У складзе мужчынскай зборнай СССР на сусветнай шахматнай Алімпіядзе (1990 г.) у горадзе Нові Сад (Югаславія) мінчанін становіцца чэмпіёнам. На пачатку дзевяностых ён упэўнена крочыць ад перамогі да перамогі: займае першыя месцы на супертурнірах у Бялградзе і Маскве, на міжзанальных турнірах у Маніле і Біле.

Рэкорды ў шахматах не фіксуюцца. Шкада, што так. Бо, калі б фіксаваліся, Барыс Гельфанд мог патрапіць у Кнігу Гінэса, як рэкардсмен СССР, Еўропы і ўсяго свету.

Звернемся да храналогіі.

На чэмпіянат СССР 1989 года ў Адэсу Барыс Гельфанд прыехаў дэбютантам, а вяртаўся ў Мінск трыумфатарам — уладальнікам шматлікіх трафеяў. Ён заваяваў бронзавы медаль і ажно тры (!) прызы: «Лепшаму дэбютанту», спецыяльны прыз часопіса «64 — шахматное обозрение» «За найбольшую колькасць матэрыялу, ахвяраванага падчас чэмпіянату СССР» і «За лепшы вынік чорнымі фігурамі».

А цяпер — фрагмент паядынку з таго чэмпіянату. Гуляюць Канстанцін Асееў і Барыс Гельфанд (чорныя фігуры).




Сваім апошнім ходам — Ле1! Барыс паставіў у дуэлі пераможную кропку. Звярніце ўвагу на дыяграму. У белых — матэрыяльная перавага: два ферзі і конь, а мат ставяць... чорныя — Фh1. Прыгожы фінал, «картина маслом», як кажуць адэсіты...

Рэкордам Еўропы можна лічыць восем гэтае дасягненне нашага земляка: 6 турніраў на міжнародным узроўні за год і ва ўсіх 6 (!) была дзяльба прызавых месцаў з удзелам Барыса Гельфанда.

Падчас чэмпіянату свету 2007 года ў далёкім Мехіка паядынак паміж расіянінам Уладзімірам Крамнікам (на той час уладальнікам шахматнай кароны) і экс-мінчанінам Барысам Гельфандам знаўцы старажытнай гульні зафіксавалі для гісторыі неафіцыйны рэкорд. На дошцы пасля 33-га ходу Крамніка (ён гуляў белымі) склалася сітуацыя на злом галавы. І вось тут навідавоку «белай гвардыі» кароль Гельфанда здзейсніў смелы, а галоўнае, нечаканы манеўр, які завецца «доўгая ракіроўка». «У чым жа была дзёрзкасць чорнага караля?» — спытаеце вы. Адказ на гэтае пытанне дае сведка — аглядальнік расійскай газеты «Спорт-экспресс» Юрый Васільеў: *«Фантастыка! Ракіроўку падчас 33 ходу яшчэ не даводзілася бачыць вашаму карэспандэнту за ўсю яго трыццацігадовую практыку шахматнага рэпарцёра. Ды гэта ж своеасаблівы сусветны рэкорд!..»*

І на заканчэнне... Калі ў спартыўнай біяграфіі выхаванца беларускай шахматнай школы Барыса Гельфанда ёсць сусветны рэкорд (няхай сабе і неафіцыйны), чаму ж у матчы чэмпіянату свету з Вішы Анандам яму не здзейсніць яшчэ адзін фантастычны ход — ход да вяршынь шахматнага алімпу?!.

**Іосіф КАЛЮТА.**

„Больш як 500 ліквідатараў працягваюць працаваць у нашых калектывах на грамадзянскіх пасадах. 39 чалавек да гэтага часу з'яўляюцца атэставанымі супрацоўнікамі, гэта значыць носяць міліцэйскую форму."


# АХОЎА

## ПАД ЗНАКАМ САВЫ

№ 4 (32)

СУМЕСНЫ ВЫПУСК «ЗВЯЗДЫ» І ДЭПАРТАМЕНТА АХОВЫ МУС РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ




„Мы павінны быць бясконца ўдзячныя ўсім нашым калегам і прадстаўнікам іншых прафесій, тым, хто сёння жыве, і тым, хто пайшоў ад нас, за падораную магчымасць спакойна жыць, працаваць і служыць свайму народу!"

## НЕ ДАДЗЕНА ПРАВА ЗАБЫЦЬ...







**26 красавіка ў апараце Дэпартамента аховы прайшлі памятныя мерапрыемствы, прысвечаныя гадавіне чарнобыльскай трагедыі. На сустрэчу з асабовым складам прыбылі ветэраны службы, якія ўдзельнічалі ў ліквідацыі наступстваў аварыі.**

Асаблівымі гасцямі сталі былы міністр унутраных спраў, генерал-лейтэнант міліцыі ў адстаўцы Юрый Сівакоў, які цяпер выкладае шэраг дысцыплін у Акадэміі МУС і іншых ВНУ, а таксама былыя кіраўнікі службы аховы — генерал-маёр міліцыі ў адстаўцы Юрый Тарабрын і палкоўнік міліцыі ў запасе Адам Азарэвіч. Гэтыя паважаныя і годныя яны былі ў ліку першых афіцэраў, накіраваных на ліквідацыю наступстваў катастрофы. Успаміны гасцей у чарговы раз ажывілі ў памяці прысутных тыя трагічныя падзеі, прымусілі зноў іх перажыць. Начальнік дэпартамента, палкоўнік міліцыі Вадзім Сіняўскі ва ўступным слове адзначыў, наколькі гераічнымі былі будні многіх і многіх супрацоўнікаў органаў унутраных спраў, іншых міністэрстваў і ведамстваў і непасрэдна падраздзяленняў аховы. Вадзім Іванавіч сказаў: «Нам не дадзена права забыць гэтую трагічную дату — 26 красавіка 1986 года. Мы павінны быць бясконца ўдзячныя ўсім нашым калегам і прадстаўнікам іншых прафесій, тым, хто сёння жыве, і тым, хто пайшоў ад нас, за падораную магчымасць спакойна жыць, працаваць і служыць свайму народу!».

## Успомніць усіх паймённа

**СВАЁ меркаванне аб трагедыі, якая адбылася 26 гадоў таму, а таксама аб тым, як сёння аддаюць даніну павагі ўдзельнікам ліквідацыі наступстваў катастрофы ў рэгіянальных падраздзяленнях аховы, выказаў палкоўнік міліцыі Віталь Казлоўскі — намеснік начальніка Дэпартамента аховы, начальнік упраўлення ідэалагічнай работы і кадравага забеспячэння.**



***— Віталь Іосіфавіч, якое ваша бачанне гэтай шматнацыянальнай бяды?***

Мінула 26 гадоў з моманту аварыі на Чарнобыльскай АЭС, аднак адгалоскі катастрофы па гэты дзень нагадваюць нам аб трагедыі, якая стала нацыянальным бедствам. Нават праз столькі гадоў людзі, сем'і, вёскі, гарады, якія непасрэдна сутыкнуліся з «нябачным ворагам» — радыяцыяй, не могуць сцерці з памяці боль, пакуты, страту блізкіх і дарагіх людзей.

***— Для Дэпартамента аховы гэтаксама блізкая памяць аб трагедыі, як і для многіх іншых міністэрстваў і ведамстваў...***

— Безумоўна! Сярод тысяч грамадзян, якія адправіліся 26 гадоў таму ў радыеактыўную зону, было нямала супрацоўнікаў службы аховы. Хтосьці з іх тады насіў агульнавайсковую форму, праходзячы тэрміновую службу ў арміі, хтосьці ўжо служыў у органах унутраных спраў і непасрэдна ў падраздзяленнях аховы. Гаворачы ў цэлым па рэспубліцы, мы можам аперыраваць наступнымі лічбамі. У ганаровых спісах Дэпартамента аховы лічацца 1320 удзельнікаў ліквідацыі наступстваў чарнобыльскай катастрофы. Амаль 700 з іх — гэта ўжо пенсіянеры службы аховы. Больш як 500 ліквідатараў працягваюць працаваць у нашых калектывах на грамадзянскіх пасадах. 39 чалавек да гэтага часу з'яўляюцца атэставанымі супрацоўнікамі, гэта значыць, носяць міліцэйскую форму. Гэтыя дастойныя людзі ёсць ва ўсіх без выключэння рэгіёнах Беларусі.

Напярэдадні 26-й гадавіны чарнобыльскай трагедыі кіраўніцтва Дэпартамента аховы палічыла сваім абавязкам успомніць усіх, хто цаной уласнага жыцця ліквідаваў наступствы катастрофы на ЧАЭС. Ва ўсіх рэгіянальных калектывах прайшло ўшанаванне ветэранаў службы аховы, якія ўдзельнічалі ў тых падзеях. Напярэдадні сіламі супрацоўнікаў і службоўцаў былі прыведзены ў парадак магілы тых нашых калег, якія ўжо пайшлі ў свет іншы. Мы не маем маральнага права здрадзіць памяці аб іх. Сустрэліся таксама з сем'ямі памерлых ліквідатараў і тых, хто па стане здароўя не змог прыняць удзел у памятных мерапрыемствах.

## «Крылаты» госць



У Дзень касманаўтыкі асабовы склад Дэпартамента аховы сустрэўся з генерал-маёрам е адстаўцы Анатолем Сульянавым. Анатоль Канстанцінавіч — асоба неардынарная. Ён заслужаны работнік культуры, пісьменнік, чые творы былі экранізаваны яшчэ ў часы Савецкага Саюза, аўтар шэрагу кніг. Прынамсі, адна з апошніх — «Узлёт і трагедыя Юрыя Гагарына». Паўстагоддзя таму, калі Гагарын паляцеў у космас, Сульянаў быў слухачом Ваеннай акадэміі ў Маскве, уваходзіў у склад рэдакцыйнай калегіі ведамаснай газеты. Яму пашчасціла ўзяць інтэрв'ю ў першага савецкага касманаўта. Сустрэча (а галоўнае, асабістыя якасці Гагарына) вельмі ўразіла журналіста, ды так, што ён застаўся верным тэме лёсу і трагедыі гэтага цудоўнага чалавека на наступныя 50 гадоў.

Для супрацоўнікаў і служачых дэпартамента дыялог з такім пачэсным госцем стаў сапраўдным падарункам, а яго ўспаміны і аповед аб далёкіх падзеях нібыта акунулі прысутных у атмасферу тых дзён.

■ ПЕРСАНАЛІІ

## ВАРТАВЫ ЧАРНОБЫЛЬСКІХ ВАРОТ



Праз тры тыдні пасля выбуху рэактара, 17 мая 1986 года, пасля чарговага дзяжурства супрацоўнік Наваполацкага гарадскога аддзела аховы Мікалай Малахоўскі разам з чатырма калегамі быў адпраўлены ў Віцебск. Адтуль міліцыянераў, мабілізаваных з усіх куткоў вобласці, накіравалі ў камандзіроўку на паўднёвы ўсход Беларусі.

Паколькі інфармацыя аб выбуху атамнага рэактара доўгі час не распаўсюджвалася, праваахоўнікі зусім не чакалі, што дзесяць дзён абернуцца месяцам. Насцярожыла толькі тое, што перад ад'ездам у Віцебск ім выдалі рэчмяшкі і рэспіратары, а ў самім абласным цэнтры пераапранулі ў спецадзенне.

— Наступную ноч мы правялі ў воінскай часці, якая дыслацыравалася ў вёсцы Савічы. А раніцай нас даставілі на кантрольна-прапускны пункт, размешчаны пры ўездзе ў 10-кіламетровую зону вакол АЭС. Пастаўленая задача практычна нічым не адрознівалася ад працы на любым іншым КПП. Таксама даводзілася выязджаць на нарыхтоўку лесу: драўніна ішла на ўзвядзенне агароджы з калючым дротам, якой абнеслі ўсю ахоўную тэрыторыю. А праз тыдзень прыбыў новы нарад, і нашаму ўзводу паставілі іншую задачу — адсяленне людзей з 30-кіламетровай зоны, — успамінае Мікалай Віктаравіч.

Праца ў новай якасці аказалася куды больш складанай, чым на КПП: было цяжка пераконваць жыхароў пакідаць свае хаты. Тым больш што для большасці слова «радыяцыя» не з'яўлялася важкім аргументам. А яшчэ праблем дадавалі ўжо былыя хатнія жывёлы: табельнай зброі міліцыянерам не выдалі, а перспектыва сустрэцца са здзічэлым сабакам падчас вячэрняга абходу спусцелага населенага пункта зусім не радавала.

Месяц, праведзены паблізу выбухнуўшага рэактара, для Мікалая Малахоўскага, як і для ўсіх удзельнікаў ліквідацыі наступстваў катастрофы, стаў не толькі асобнай старонкай аўтабіяграфіі, але і дадаў нямала запісаў у медыцынскую карту. У 1997 годзе Мікалай Віктаравіч пайшоў у адстаўку ў званні маёра па стане здароўя: моцна «сеў» зрок. А добрасумленнай службе ў органах унутраных спраў ён аддаў больш за 20 гадоў, прайшоўшы шлях ад простага міліцыянера да камандзіра роты.

## Гэта мая зямля!

Вясной 1986 года радыеактыўнае воблака прызямлілася ў пяці раёнах Магілёўшчыны. У Чэрыкаўскім, Слаўгарадскім, Краснапольскім, Клімавіцкім і Касцюковіцкім раёнах з'явіліся кантрольна-прапускныя пункты, мноства знакаў з надпісам «радыяцыя».

Прайшлі гады, але, на жаль, «плямы» на карце Беларусі застаюцца. Праўда, дзе-нідзе на «рэабілітаваныя» тэрыторыі вярнуліся людзі. Былы начальнік Чэрыкаўскага аддзялення Дэпартамента аховы маёр міліцыі ў запасе Сяргей Бязрукаў успамінае: «Я нарадзіўся ў Чэрыкаўскім раёне, тут вучыўся, ажаніўся і працую, нягледзячы ні на што. У 1984 годзе па рэкамендацыі калектыву аўтабазы Чэрыкава я паступіў на службу старшым інспектарам аховы аддзялення пазаведамаснай аховы пры Чэрыкаўскім раённым аддзеле ўнутраных спраў. А праз два гады мы, тады яшчэ маладыя супрацоўнікі, як адзін выйшлі на барацьбу з радыяцыяй. Напачатку паўстала пытанне першачарговага адсялення вёсак. Людзі, пакідаючы сваё жытло, нічога не маглі ўзяць з сабой. Гаспадаркі і прадпрыемствы пакідалі сваю ўласнасць ахоўваць нам. Уяўляеце, колькі забруджаных будматэрыялаў, каляровых металаў, іншых матэрыяльных каштоўнасцяў, грыбоў, ягад, мяса, вывезеных з зоны, з'явілася б у розных раёнах рэспублікі?».

На жаль, не ўсё, забароненае да вывазу, удавалася затрымліваць. Лясных дарог і сцежак шмат, а сіл і сродкаў, каб перакрыць кожную, не хапала. Тым не менш супрацоўнікі, якія ахоўвалі зону, прыкладалі максімум намаганняў, каб не дапусціць распаўсюджвання радыяцыйнай заразы.

Паводле слоў Сяргея Аляксандравіча, нават сёння, калі мінула 26 гадоў пасля аварыі, даводзіцца ахоўваць лес ад браканьераў, зборшчыкаў ягад і грыбоў. Часта трапляюцца і аматары каляровага лому. Ахвотнікі пажывіцца, здаецца, не разумеюць, якой небяспецы падвяргаюць сябе і сваіх блізкіх.

## На вайне з нябачным ворагам



Аляксандр Шніп у 1988 годзе служыў на пасадзе дзяжурнага пункта цэнтралізаванай аховы аддзялення пазаведамаснай аховы пры аддзеле ўнутраных спраў Заслаўскага гарвыканкама. У складзе зводнага атрада УУС Мінаблвыканкама старшы лейтэнант міліцыі быў накіраваны на ахову грамадскага парадку ў адселенай зоне. Частка атрада, дзе Аляксандр Шніп быў прызначаны кіраўніком змены, дыслацыраваўся ў Нароўлі. Падраздзяленне займалася не толькі аховай грамадскага парадку, але і барацьбой з марадзёрамі, якія пацягнуліся ў зоны чалавечага няшчасця. Кантрольна-прапускны пункт размяшчаўся ў вёсцы Белы Бераг за 12 кіламетраў ад райцэнтра. Там неслі службу па двое — вадзіцель аўтамашыны і старшы змены.

— Некаторыя агульныя веды па радыяцыі ў нас былі, — распавядае Аляксандр Адольфавіч, — але наколькі гэта сур'ёзна, ніхто з нас на той час не ўяўляў.

Аднак самым страшным і незразумелым для супрацоўнікаў міліцыі былі пустыя вёскі і дамы. Усё гэта выглядала неяк ненатуральна: у хатах засталіся рэчы, посуд, мэбля. Было такое ўражанне, што гаспадары кудысьці выйшлі і вось-вось вернуцца.

— Асабліва цяжка станавілася на душы, калі да калючага дроту падыходзілі пажылыя, якія тут нарадзіліся і пражылі большую частку свайго жыцця, прасілі прапусціць іх «паглядзець на хату», — успамінае ліквідатар. — На жаль, вярнуцца дадому жыхарам не ўдалося. Вёскі, дзе ўзровень радыяцыі быў меншы, спалілі, а іншыя проста пахавалі.

У небяспечнай камандзіроўцы Аляксандр Шніп прабыў два месяцы. Пасля вяртання афіцэр закончыў Акадэмію МУС, а ў 2007 годзе пайшоў на заслужаны адпачынак з пасады камандзіра роты Першамайскага аддзела Дэпартамента аховы. Аднак адпачываць маёр міліцыі ў запасе не прывык. Цяпер Аляксандр Адольфавіч працягвае службу ў Маскоўскім аддзеле аховы грамадзянскім спецыялістам па ліцэнзаванні.

## У крузе першым



У Лідскім аддзеле Дэпартамента аховы сёння працуюць 13 чалавек, якія бралі непасрэдны ўдзел у ліквідацыі наступстваў аварыі. Некаторыя з іх былі ў ліку першых, хто ступіў у атамнае пекла.

Адзін з іх — малодшы інспектар аховы, вадзіцель спецыяльнай групы міліцыі, прапаршчык Валерый Жылінскі. У першыя дні трагедыі ён, знаходзячыся на тэрміновай службе ў якасці вадзіцеля бронетранспарцёра, быў накіраваны да выбухнуўшага рэактара — забяспечваць выстаўленне варты па ахове АЭС.

Паводле слоў Валерыя Вацлававіча, выконваць пастаўленыя задачы даводзілася ў непасрэднай блізкасці: адлегласць да сцен чацвёртага рэактара часам дасягала 150—200 м. Службу неслі кругласутачна, узровень радыяцыйнага фону на пастах быў вельмі высокі, таму выдаваліся прафілактычныя сродкі для аховы арганізма ад уздзеяння радыяцыі.

— Перад заступленнем у нарад нам далі новыя камбінезоны белага колеру і сродкі засцярогі органаў дыхання. Пасля завяршэння працы гэтая спецвопратка ўтылізавалася, выдавалася новая, і так некалькі разоў за дзень, — успамінае Жылінскі.



Першае нясенне службы Валерыя Вацлававіча паблізу рэактара доўжылася каля двух месяцаў. Другі раз у тым жа 1986-м годзе ахоўваць грамадскі парадак прыйшлося ўжо ў 30-кіламетровай зоне ў верасні—лістападзе.

Валерый Вацлававіч — заўсёды ганаровы госць падчас сустрэч з маладымі супрацоўнікамі. Многія з іх, аднагодкі «Чарнобыля», ведаюць пра яго толькі з хронікі, таму аповеды бывалага ліквідатара надаюць асаблівую значнасць такой далёкай і адначасова такой блізкай усім нам трагедыі.

## «Ленінцы» ў дзеянні

**Пасля апоўначы да экіпажа Ленінскага аддзела аховы (г. Мінска), які патрулюе па раёне, звярнуўся 35-гадовы мінчанін. Мужчына растлумачыў, што некалькі хвілін таму трое хлопцаў, пагражаючы нажом, адабралі ў яго машыну «Аўдзі-100» і зніклі. Міліцыянеры па радыёстанцыі перадалі інфармацыю дзяжурнаму, які накіраваў на месца здарэння дадатковы нарад.**



Спрабуючы спешна ўцячы на выкрадзенай іншамарцы, у раёне Камвольнага камбіната зламыснікі сутыкнуліся з яшчэ адным таксі, у якім знаходзіліся вадзіцель і пасажыр. Адзін з падазроных атрымаў сур'ёзныя траўмы, двое іншых накіраваліся ў бок ракі Свіслач. Першая група затрымання аховы — камандзір роты, маёр Аляксандр Чэкан, прапаршчык Аляксандр Цішкевіч і міліцыянер-вадзіцель Дзмітрый Цітко, прыбыўшы да месца ДТЗ, апытала відавочцаў. Міліцыянеры ўдакладнілі прыметы згоншчыкаў і кірунак, у якім тыя зніклі. Перадаўшы інфармацыю дзяжурнаму, першы экіпаж пачаў праследаванне. Каб злавіць злачынцаў, дзяжурны накіраваў яшчэ адзін нарад аховы ў складзе прапаршчыка Яўгена Кузьміцкага і міліцыянера-вадзіцеля, старшыны Дзяніса Кірэева.

Пры адпрацоўцы дваровай тэрыторыі першы экіпаж каля дома 33 па вуліцы Барадзінскай выявіў аднаго з падазроных. Ім аказаўся 17-гадовы навучэнец сталічнага ПТВ. У гэты ж час на вуліцы Якубава другі экіпаж затрымаў 18-гадовага, раней судзімага за хуліганства мінчаніна, які і падазраецца ў непасрэдным учыненні разбойнага нападу на таксіста (пасля пацярпелы паказаў менавіта на яго). Трэцяга саўдзельніка злачынства затрымалі супрацоўнікі крымінальнага вышуку Ленінскага РУУС. 20-гадовы, раней судзімы мінчанін жыў непадалёк і паспеў схавацца дома. Верагодна, маладому чалавеку і ўдалося б адсядзецца ва ўласнай кватэры, але хаўруснікі паведамілі аператыўнікам яго адрас.

У дачыненні да «крымінальнага трыа» заведзена крымінальная справа па факце групавога разбою.

■ Адчуванне

## «ЭКСКУРСІЯ» Ў СТАЛІЦУ ПРЫВЯЛА НА НАРЫ

Каля поўначы група затрымання Ленінскага аддзела аховы сталіцы рухалася па сваім маршруце. Сустрэць грамадзян на вуліцы нават у такі позні час — звычайная справа. Але маладыя людзі, якія сядзелі на лаўцы ў адным з двароў па праспекце Ракасоўскага, павялі сябе дзіўна. Заўважыўшы міліцыянераў, яны сталі хавацца за дрэвамі. Экіпаж аховы — прапаршчык міліцыі Вячаслаў Дзянісік і сяржант міліцыі Арцём Ляшнеўскі вырашылі праверыць дакументы ў паўночнікаў. Тыя тлумачылі, што прыехалі на аўтарынак «Малінаўка» па запчасткі, куды накіруюцца раніцай, а дакументы знаходзяцца ў аўтамабілі, які прыпаркаваны за некалькі кварталаў адсюль. Ахоўнікі праверылі і мікраўтобус, паколькі паводзіны жыхароў Магілёўшчыны падаліся ім падазронымі, але нічога ў салоне не знайшлі. На тым начное знаёмства магло б і закончыцца. Ды праз некаторы час ахоўнікі засталі старых знаёмых на тым жа самым месцы. На гэты раз яны нешта даставалі з-за дрэва. Цяпер у «ленінцаў» не было сумнення ў тым, што падазрэнні былі недарэмныя. Міліцыянеры дагналі ўцекачоў хутка. Затрыманыя маладыя людзі 20 і 29 гадоў кралі з машын замежнай вытворчасці магнітолы (на момант затрымання іх было пяць). «Экскурсія» ў сталіцу закончылася дзвюма крымінальнымі справамі.

### А тым часам у Бабруйску

мясцовы жыхар звярнуўся ў міліцыю з заявай, што з яго машыны ўкралі аўтамагнітолу і акумулятар. Нарад аддзела аховы ў складзе міліцыянера-вадзіцеля Сяргея Сахара і міліцыянера-кінолага Аляксандра Альвінскага агледзелі легкавушку з разбітым бакавым шклом і сталі адпрацоўваць тэрыторыю. Відавочцы апісалі прыкметы падазронага, а службовы сабака Джэры адразу ўзяў след і прывёў да маладога чалавека з цэлафанавым пакетам у руках, дзе аказалася дзве аўтамагнітолы. Адкуль яны ўзяліся, хлопец не мог патлумачыць.

Чуццё і вопыт падказалі старшым прапаршчыкам, што знаходка стане не адзінай. У кватэры падазронага ахоўнікі знайшлі крадзеныя рэчы і затрымалі двух яго саўдзельнікаў. Высветлілася, што тройка займалася аўтамабільнымі крадзяжамі. У асноўным іх аб'ектамі былі іншамаркі, але нярэдка даставалася і лёгкадаступным «Жыгулям». Акрамя мноства разнастайных магнітол і акумулятараў, былі знойдзены і асабістыя рэчы кіроўцаў.



СУБОТНІК

## Марафон чысціні



Супрацоўнікі цэнтральнага апарата Дэпартамента аховы па традыцыі прынялі ўдзел у рэспубліканскім суботніку — прычым на сваіх рабочых месцах. У прыватнасці, яны прыводзілі ў належны стан службовыя, адміністрацыйныя памяшканні, займаліся добраўпарадкаваннем: падрыхтавалі клумбы для кветак, ачысцілі прылеглую тэрыторыю ад мінулагодняга лісця і сухога галля, пабялілі плот і бардзюры, навялі парадак каля стэлы супрацоўнікам Дэпартамента аховы МУС Беларусі, якія загінулі пры выкананні службовых абавязкаў.



Матэрыялы спецвыпуску падрыхтавалі: У. ЗДАНОВІЧ, А. ГЕРАСІМАЎ, А. ЯРМАЛІНСКАЯ, Н. СВІДУНОВІЧ, А. НОВІК, Н. ЛЕРНАТОВІЧ, А. ДАНІЛЬЧАНКА, Л. УШЭНІН, А. КАВАЛЕЎСКАЯ.

## ИЗВЕЩЕНИЕ
### о проведении 12 июня 2012 года аукциона по продаже в частную собственность земельного участка для строительства и обслуживания одноквартирного жилого дома в Мухавецком сельском Совете Брестского района

| № лота | Местоположение земельного участка | Площадь, га | Начальная (стартовая) стоимость земельного участка руб. | Целевое назначение земельного участка и его кадастровый № |
|---|---|---|---|---|
| 1. | **Агр. Мухавец, ул. 60 лет Октября, 116** | 0,1632 | 23 264 350 | строительство и обслуживание одноквартирного (блокированного) жилого дома; № 121283305601000742 |
| | Сумма задатка, руб. | | 2 326 435 | |
| | Расходы на изготовление земельно-кадастровой документации, руб. | | 1 168 831 | |
| | Расходы на объявление в средствах массовой информации, руб. | | Согласно акту выполненных работ | |

Земельный участок расположен в агрогородке Мухавец по ул. 60 лет Октября, 120. Рядом с участком проходит автодорога Брест–Малорита–граница Украины. По улице проложен магистральный газопровод и построена линия электропередачи. Участок свободен от застройки.

Аукцион будет проводиться **12.06.2012 в 10.00** по адресу: Брестский район, агр. Мухавец, ул. 60 лет Октября, 21 ( здание сельисполкома). Для проведения аукциона необходимо наличие не менее 2-х участников.

Для участия в аукционе необходимо подать заявление об участии в аукционе, копию платежного поручения, подтверждающего внесение на расчетный счет Мухавецкого сельисполкома № 3600213070062 в филиале 100 АСБ «Беларусбанк», код 246, УНП 200676206, код платежа 04901 залога в размере 10% от начальной цены земельного участка; документ (паспорт), подтверждающий личность покупателя.

Заявления на участие в аукционе принимаются по адресу: **агр. Мухавец, ул. 60 лет Октября, 21** (здание сельисполкома) **с 8.00 до 13.00 и с 14.00 до 17.00 по рабочим дням. Последний срок подачи заявлений 06 июня 2012 года до 17.00.**

## ОДО «ЮгАгро» ИЗВЕЩАЕТ О ПРОВЕДЕНИИ ОТКРЫТОГО АУКЦИОНА
### по продаже дебиторской задолженности, принадлежащей ОДО «ЮгАгро»

Организатор торгов: управляющий в деле о банкротстве ООО «Диспонент»:
г. Гомель, ул. Молодости, 5, комн. 1, моб. (8029) 621-22-36, тел. 68-26-34.
Продавец дебиторской задолженности: ОДО «ЮгАгро», г. Гомель, Привокзальная площадь, д. 1
**Аукцион состоится 21.05.2012 г. в 12 ч. 00 мин. по адресу: г. Гомель, ул. Молодости, д. 5 комн. 1.**

| Наименование дебитора | Место нахождения имущества (дебиторской задолженности) | Номинальная стоимость задолженности | Размер уценки | Начальная цена продажи, без НДС, руб. | Задаток, руб. |
|---|---|---|---|---|---|
| **Лот № 1** КСУП «Звезда» (дебиторская задолженность по судебному приказу) | Чечерский район, д. Залесье, ул. Советская, 52 | 3 966 570 | 10% | 3 569 913 | 178 495 |
| **Лот № 2** ГСУ «Турская сортоиспытательная станция» (дебиторская задолженность по судебному приказу) | п. Турсковой, Рогачевский район, ул. Советская, 1 | 30 951 480 | 10% | 27 856 332 | 1 392 820 |
| **Лот № 3** КСУП «Нивы» (дебиторская задолженность по судебным приказам) | Жлобинский район, Солонский с/с, ул. Советская, 29, комн. 409 | 106 684 213 | 10% | 96 015 792 | 4 800 790 |

Заявления и прилагаемые к нему документы принимаются с момента опубликования настоящего извещения по адресу: г. Гомель, ул. Молодости, д. 5, комн. 1 с 9.00 до 17.00 в рабочие дни. **Прием документов заканчивается 18 мая 2012 г. в 16.00.**

Задаток перечисляется до **18.05.2012 года** (включительно) на р/с 3012213560026 в ГФ по Гомельской области ОАО «Белинвестбанк», МФО 151501768, УНП 490492855.

Условия продажи – без условий.

Шаг аукциона в размере 5% от начальной цены.

В случае признания торгов несостоявшимися, в связи с подачей заявления на участие в них только одним участником, возможна продажа доли этому участнику при его согласии по начальной цене, увеличенной на 5%.

Победителем аукциона признается участник, предложивший наибольшую цену покупки.

**По вопросам участия в аукционе и приобретения имущества должника обращаться по телефонам: (8-029) 621-22-36, 68-26-34**

## ИНФОРМАЦИЯ О ПРОВЕДЕНИИ АУКЦИОНА БЕЗ УСЛОВИЙ ПО ПРОДАЖЕ НЕДВИЖИМОГО ИМУЩЕСТВА

| | |
|---|---|
| **Адрес объекта и его наименование** | - здание деревообрабатывающего цеха, общей площадью 1509,8 м² с инвентарным № 630/С-42263.<br>Начальная стоимость **536 129 531** рубль без учета НДС, адрес: г. Молодечно, ул. Молодежная, 8А.<br>Шаг аукциона в размере 5% от предыдущей цены |
| **Порядок оплаты** | Оплата в размере цены продажи объекта (за вычетом задатка) в течение 15 календарных дней на р/с Продавца с момента заключения договора купли-продажи, который будет заключен с Победителем в течение 15 календарных дней после проведения аукциона |
| **Сумма задатка** | 10% от начальной цены на р/с 3012190930030 в отделении 932 ОАО «Белинвестбанк», г. Молодечно, код 739, УНН 600182305, ОКПО 04064333, получатель: СИКУП «УКС-Сервис» |
| **Продавец** | **Открытое акционерное общество «Молодечненское агропромэнерго»** |
| **Организатор аукциона** | СИКУП «УКС-Сервис», г. Молодечно, ул. Мира, 15, каб. 1 |
